Дзень Волі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

За сваё ў Нараўцы ☞ 12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 14 (2760) Год LIV | Беласток, 5 красавік 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Серада, 25 Сакавіка

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Мой асабісты Дзень Волі пачаўся з інтэнсіўных пошукаў сцяга, які кожны год праз акно абвяшчае свету, што гэта незвычайны дзень. Няшмат такіх сцягоў у горадзе, але і не ў тым сутнасць, бо гэта толькі асабістае рашэнне. Пасля шматлікіх гадоў святкавання здаецца мне, што самым важным 25 Сакавіка з'яўляецца сустрэча. Штодзень кантактуемся, бачымся на працы, гаворым па тэлефоне, але калі надыходзіць адзіны момант у годзе, калі святочна апранаемся і прыходзім у адно месца, каб правесці вечар сярод суадчуваючых значэнне гісторыі і нашай будучыні — становімся адным цэлым. Немагчыма, каб забыць пра адносіны між людзьмі, якія не заўсёды маюць сяброўскі характар, але гэта час, калі прынамсі стараемся не крыўдзіць нікога і не гаварыць уголас, што нам кепска, бо аб'ядноўвае нас будучыня і неўміручая надзея. Гавару пра гэта ўсё пафасна і асабіста, бо здаецца мне, што гэта найбольш натуральна якраз у гэтым кантэксце. Сапраўднае свята адчуваю, калі прыязджаю да бабулі і кажу „Хрыстос Уваскрос!" ці „З Ражджаством!". Якая тады розніца між царкоўнымі святамі і Днём Волі, калі кажам „Жыве Беларусь!" ды спяваем „Магутны Божа". Няма такой. Затое складаецца ўражанне, што мы гадамі чакалі, каб праваслаўнасць большасці беларусаў Падляшша адлюстравана была вось у гэты дзень. Сёлета нашу патрэбу задаволіла супольная малітва з беларускім манахам, айцом Сяргеем з Віцебшчыны, які прыехаў у Беласток адслужыць каталіцкае набажэнства на беларускай мове. Зразумела, не быў гэта просты вопыт для праваслаўных, бо малітвы мелі каталіцкі характар, мова аднак прыблізіла нас да ідэі свята і яго рэлігійнага сэнсу.

— Бог разумее на ўсіх мовах, па-беларуску таксама, — сказаў айцец Сяргей. Для нас гэта бясспрэчнае, але прыемна, калі і перад алтаром кажа гэта святар, які, дарэчы, з касцёла разам з намі перайшоў у беластоцкі клуб „Фама".

— Беларусь не хацела майго вяртання, — паплылі з экрана ў „Фаме" словы аднаго з герояў фільма.

Здавалася мне, што гэта быў першы сапраўдны момант задумы ў час вячэрняй часткі беластоцкіх святкаванняў Акту 25 Сакавіка. Лявон Рыдлеўскі як гімназіст змагаўся ў Слуцкім паўстанні, пра якое распавядаў фільм „Слуцкі збройны чын". Гэта была адна з дзвюх прадукцый тэлеканала „Белсат", якія дэманстраваліся ў час мерапрыемства. Гэта былі важныя акцэнты перш за ўсё беручы пад увагу тэмы. Слуцкае паўстанне, як важная гістарычная падзея, моцна звязана з кароткім існаваннем Беларускай Народнай Рэспублікі, кантраставала з асобай героя карціны „Гаспадар" — поўнага рэфлексіі, жывучага ў самоце старэйшага чалавека. Было аднак у гэтым нешта супольнае. Герой фільма „Гаспадар" стварае свой драўляны народ, які ніколі не ажыве, але, паводле творцы, які адзіны разумее сэнс цяжкай працы, а праца гэта штодзённае змаганне. За сваю праўду і свой свет змагаліся таксама героі Слуцкага паўстання. Фільмы ў пэўным сэнсе і нам паставілі пытанне: у якім свеце мы хочам жыць, як хочам жыць. Першы просты адказ даў Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза ў Польшчы, які нагадаў пра бліжэйшы перапіс насельніцтва ў 2011 годзе, у якім маем чарговы шанс падкрэсліць сваю прысутнасць, паказаць, што мы надалей тут, у сябе, а можа і нават нашая колькасць павысілася. Гэта мара, але ж мы вельмі надзейныя людзі, таму што кожны год распаўсюджваем ідэю нашага Свята Незалежнасці ды паказваем, што незалежнасць мае розныя абліччы.

Каб падкрэсліць шматбаковасць і сэнс дзеянняў беларусаў Падляшша ў карысць падтрымлівання сваёй культуры і тоеснасці, кожны год тры асобы ўзнагароджваюцца букетам бел-чырвона-белых кветак. Адзін з узнагароджаных пажартаваў, што кветкі ў такім выглядзе надаюцца хутчэй на магілу, але дзейнасць, за якую іх прызначаюць, шчасліва адводзіць ад магілы беларускую меншасць. Можа варта тады падумаць над іншым спосабам узнагароджвання рупліўцаў нашай беларушчыны, але напэўна трэба застацца пры гэтай ідэі. Сярод узнагароджаных — доктар Лена Глагоўская, якая гадамі працуе над вяртаннем нашай памяці здарэнняў ды людзей, прыбліжае нашу сутнасць да праўды, як гістарычнай, так і штодзённай. Праца Ігара Лукашука ды Звязу беларускай моладзі над стварэннем супольна з Маршалкоўскай управай культурнага шляху „Дрэва і сакрум" — гэта крок да рэальнага існавання беларускай мовы і культуры ў польскай прасторы. На табліцах, у даведніках, буклетах звычайна паяўляецца беларуская мова, для якой не трэба прымаць ніякіх законаў. Яна ёсць і будзе. Таксама і прозвішча Анатоля Вапа не павінна быць абыякавым падляшскім беларусам, бо хаця ён перш за ўсё з'яўляецца фанатам гісторыі, то мова і культура беларусаў ляжыць яму на сэрцы кожнага дня, без выхадных.

Упрыгожыў наша свята таксама госць з Мінска. Бард Зміцер Бартосік з вялікай пашанай, але і дыстанцыяй да сябе і свету, спяваў і пра Слуцк, і пра настальгію па Вільні ды выканаў свой вялікі гіт пра ўгнаенні. Патрэбны быў гэты выступ. Такі шчыры, якімі і мы павінны быць штодзень. Здаецца мне, што гэты наш пафас і патрыятызм пачынае даспяваць дзякуючы таму, што хочам сустракацца, гаварыць і будаваць сваю рэчаіснасць, а, здаецца, што ўдзельнікаў гэтых дыскусій зараз становіцца больш. Нават менш чуваць было пра тое, што здарылася ў Мінску. Адчувалася, што наш падляшскі свет і нашы справы нашмат важнейшыя.

Арганізатарамі мерапрыемства ў гэтым годзе былі: „Ніва", Радыё Рацыя, Телеканал БелСат, Беларускі саюз у Польшчы.

Узнагароджаныя: доктар Лена Глагоўская, Ігар Лукашук і Анатоль Вап

Фота Стэфана Свярубскага

— Бог разумее на ўсіх мовах, па-беларуску таксама, — сказаў айцец Сяргей. Першы раз у беластоцкім фарным белым касцёле служылася імша на беларускай мове

Надзейная справа ☞ 2

Яўген ВАПА

Зараз беларуская мова становіцца дапаможнай у самакіраванні горада Гайнаўкі, Орлі, Нараўкі. Спадзяемся, што неўзабаве і іншыя гмінныя самакіраванні пакарыстаюцца гэтым правам. А ідучы за прыкладам іншых нацыянальных меншасцей, у сваіх родных мясцовасцях прагаласуюць за ўстанаўленне двухмоўных указальнікаў...

Яновіч у Гарадку ☞ 4

Міра ЛУКША

Стрыкі ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У царскай Орлі ☞ 8

Міхал МІНЦЭВІЧ

Сход „Гаю" ☞ 10

Міхась СЦЕПАНЮК

Ян Мордань

Права кожнага

Гэта сапраўды выглядала вельмі сімвалічна — гадзіннікі ў гэты дзень былі пераведзены на летні час, а беларускія праваабаронцы ўжо ў трэці раз сабраліся на свой устаноўчы сход, каб нарэшце, у нібыта спрыяльны для гэтага час (спрыяльны чыста тэарэтычна), паспрабаваць зарэгістравацца. На вуліцы нарэшце вясна, а ў сталіцы Беларусі, у памяшканні Беларускага народнага фронту, 82 прадстаўнікі з усіх рэгіёнаў Беларусі, вырашылі стаць сузаснавальнікамі праваабарончай арганізацыі „Наша Вясна".

Праваабарончы цэнтр „Вясна", які ўзнік на хвалях масавага пратэсту беларускага грамадства і дэмакратычнай апазіцыі, і напачатку быў вядомы як „Вясна-96", ужо быў калісьці зарэгістраваны. Ну, але пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года, калі займаючыся незалежным назіраннем за выбарчым працэсам беларускія праваабаронцы абвясцілі, што ўгледзелі безліч парушэнняў выбарчага заканадаўства з боку ўлады, то ўлада, у сваю чаргу, вуснамі сваіх ведамстваў таксама абвясціла, што такая праваабарончая арганізацыя ёй непатрэбная і ў 2003 годзе дэлегалізавала яе. Якая праваабарончая арганізацыя ёй, гэтай уладзе, патрэбна, яна не ўдакладніла. Відаць, аніякая непатрэбна. З таго часу праваабаронцы пазбаўленай рэгістрацыі „Вясны" сталі выконваць свае маральна-этычныя абавязкі перад грамадствам без афіцыйнага статусу. Але адыходзіць ад сваіх перакананняў не збіраліся.

Што такое пазбаўленне рэгістрацыі? Добраахвотным ахоўнікам правоў чалавека гэта мала шкодзіла. Спецыфіка праваахоўнай дзейнасці і шматгадовы вопыт сяброў пазбаўленай рэгістрацыі арганізацыі дазвалялі не збаўляць эфектыўнасць працы, а наадварот, знаходзіць новыя, больш дзейсныя шляхі. Забарона „Вясны" больш біла па іміджу ўлады, якая паказала ўсяму свету, а найперш беларускаму грамадству, што ўлада мае прычыны баяцца афіцыйнай дзейнасці людзей, якія ўсяго толькі хочуць, каб тая ўлада выконвала сваё ж заканадаўства і шанавала правы свае і сваіх суайчыннікаў.

З тых часоў вясноўцы прайшлі доўгі шлях. Нярэдка ім прыходзілася пад аховай міліцыі дзяліць месца ў камеры з тымі людзьмі, інтарэсы якіх яны адстойвалі. Прыйшлося прайсці праз пратрусы, запалохванні, выклікі, маральны і псіхалагічны ціск... Але затое беларускае грамадства і дэмакратычная апазіцыя заўсёды ведалі — у Беларусі ёсць праваабаронцы і яны працуюць. Эфектыўнасць іх працы не стала незаўважанай і міжнароднай супольнасцю. Як вынік — лідар вясноўцаў Алесь Бяляцкі быў абраны віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, а таксама быў вылучаны на Нобелеўскую прэмію міру. І ён, і іншыя праваабаронцы, неаднаразова ўзнагароджваліся рознымі міжнароднымі прэміямі, як прызнанне мужнасці, цвёрдасці і адданасці абранаму шляху...

Што ж цяпер? Цяпер, кажуць, беларуская ўлада хоча размаўляць з Еўропай. Маўляў, знайшла і там свае інтарэсы. А некаторыя нават сцвярджаюць, што яна ўжо так загнала сябе ў кут сваёй прарасейскай палітыкай, якую нібыта вяла ўсе гэтыя гады для Масквы і па загадзе Крамля, што зараз, калі тая палітыка цалкам збанкрутавала, не мае іншага выйсця як прарывацца ў Еўропу хаця б дзеля грошай і выключна па грошы. А дзеля гэтага трэба хоць крыху паказаць сябе дэмакратамі. Таму могуць пайсці нават на тое, каб зарэгістраваць пару-тройку арганізацый, у тым ліку і „Нашу Вясну".

Так гэта ці не — паглядзім. Для праваабаронцаў гэта ўсяго толькі яшчэ адна лакмусавая паперка, якая пакажа, ці гатовая сённяшняя ўлада хоць бы на дробныя касметычныя крокі наперад. У кожным выпадку, будзе зарэгістравана „Наша Вясна", ці Міністэрства юстыцыі чарговы раз знойдзе зачэпкі, каб напісаць сваё магічнае слова „адмоўлена", праваабаронцы на Беларусі усё адно працаваць будуць. Беларуская нацыя ўжо даказала, што ў беларусаў хапае неабыякавых і самаахвярных людзей, якія будуць змагацца з несправядлівасцю да таго часу, пакуль яна існуе. Бо кожны чалавек мае права.

І не важна, якая будзе ўлада. Чалавек не павінен быць безабаронным ні перад якой уладай. Нават перад самай лепшай.

Віктар САЗОНАЎ

Надзейная справа

З вялікім хваляваннем прыходзіцца нам наглядаць якім крутым і складаным з'яўляецца шлях беларускага народа да сваёй поўнай незалежнасці — ідэі, якая 91 год таму, назаўсёды, дзякуючы айцам Беларускай Народнай Рэспублікі, упісалася ў сэрцы і душы беларусаў. Незалежнасць — гэта выклік. А з выклікамі, якія ставім перад сабою, бывае па-рознаму. Асабліва, калі насупраць тваёй мовы, культуры, незалежнасці ідзе супраціў не толькі ад вонкавых фактараў, але таксама ад беларускіх рук у імя ўлады, дзеля якой разбураюцца нацыянальныя фундаменты і генатып роднай мовы ды культуры. Гэтага не можам інакш назваць як злачынствам супраць свайго народа і дзяржавы. Але гісторыя паказвае прыклады, што за здзек над сваім такіх людзей чакаў не толькі суд Божы і суд гісторыі, але часта даводзілася яшчэ асудзіць іх пры жыцці незалежнымі судамі. Бо нягледзячы на ўсё, мы мусім памятаць пра тое, што справа нацыянальнай незалежнасці ёсць і заўсёды будзе справай надзейнай. Пакуль людзі хочуць быць гаспадарамі на сваёй зямлі, то з іхніх думак і летуценняў не знікне і беларуская дзяржава. Зразумела, шмат людзей ужо зняверылася ў лепшае нацыянальнае і асабістае будучае. Працягваецца палітычная і эканамічная эміграцыя з Беларусі. Пакінутыя на цяжкае выжыванне і выпрабаванне сотні тысяч беларусаў злоўжываюць алкаголем ці наркотыкамі. Балюча і крыўдна робіцца на душы, калі даведваешся, што чарговыя таленавітыя людзі свету культуры, навукі, журналістыкі ці палітыкі незапатрабаваныя ў сваёй дзяржаве толькі па той прычыне, што яны думаюць і ўсё робяць з беларускага пункту гледжання. Некаторыя з іх, не вытрымаўшы ўсяго гэтага, не па сваёй волі апынуліся ў іншым, мабыць, лепшым свеце. Але менавіта дзеля духоўнага ўзмацнення і еднасці, у імя беларускасці адзначаем мы 25 Сакавіка, наш Дзень Волі, які для нас, беларусаў, яшчэ не завяршыўся поўнай перамогай, але які дазваляе нам адчуваць сябе роўнымі з іншымі народамі. І дазваляецца нам у гэты дзень спадзявацца, што яшчэ за нашага часу зможа беларускі народ пад дзяржаўнымі бел-чырвона-белымі сцягамі і гербам Пагоня вызначаць сваю незалежнасць і будаваць палітычную прысутнасць на міжнароднай карце.

Для нас, беларусаў Беласточчыны, не менш важным фактарам з'яўляецца тое, што святкаванні Акту 25 Сакавіка пашыраюцца сярод школьнай моладзі ў Бельску, Гайнаўцы, Гарадку. Зараз беларуская мова становіцца дапаможнай у самакіраванні горада Гайнаўкі, Орлі, Нараўкі. Спадзяемся, што неўзабаве і іншыя гмінныя самакіраванні пакарыстаюцца гэтым правам. А ідучы за прыкладам іншых нацыянальных меншасцей, у сваіх родных мясцовасцях прагаласуюць за ўстанаўленне двухмоўных указальнікаў. Такім чынам наша шматвяковая прысутнасць на гэтай зямлі прыняла б і відочнае вонкавае выяўленне. Гэта было б актам нацыянальнай спеласці і фактычным доказам беларускай адказнасці за лёс і будучыню нашых „малых айчынаў". Лёс нашай меншасці залежыць перад усім ад таго як нашы лакальныя палітыкі кшталту войтаў, бурмістраў, старастаў захочуць супольна працаваць таксама і ў карысць беларускасці сваіх выбаршчыкаў. Калі не будзе тут нас — беларусаў — то не будзе ўжо каму іх выбіраць. У гэты святочны дзень трэба, каб усе памяталі, што праз два гады, у 2011 годзе, будзе чарговы перапіс насельніцтва ў Польшчы, дзе апрача пытання пра нацыянальнасць будзе і пытанне пра веравызнанне. У гэты такі важны для нас дзень заклікаю, каб беларускія самаўрадаўцы, рэлігійныя дзеячы і духоўныя асобы, нашы арганізацыі, беларускія журналісты і масмедыі, супольна і сістэматычна вялі інфармацыйную працу на гэтым полі. Мы не можам ухіляцца ад гэтай адказнасці і тлумачыць усё неспрыяльнымі нам абставінамі. Тое, што мы павінны зараз жа зрабіць — робім для самай надзейнай справы. Справа, у якую ж верым, то тое, што мы, беларусы Беласточчыны, былі тут і будзем надалей. А святкаванні Дня Волі пяройміць і будуць арганізаваць маладыя пакаленні і новыя асяродкі. У кожнай беларускай гміне ці школе, дзе вядзецца навучанне беларускай мовы — гэты дзень стане днём беларускай годнасці і згоды. І святкаванні яго будуць найлепшай падзякай тым, хто ў змаганні і штодзённай працы за беларускасць ахвяраваў самім сабою. Мы з гэтага месца ім усім дзякуем і памятаем пра мінулае дзеля будучыні.

Жыве Беларусь!

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Як далёка адсюль...

Пад канец сакавіка мой шэф намовіў мяне наведаць Падляшскі турыстычны кірмаш у Беластоку, галоўным арганізатарам якога была Падляшская рэгіянальная турыстычная палата:

— Паглядзі, якія ў турыстычных фірм польска-беларускія трансгранічныя прапановы, — сказаў мне рэдактар.

У спартзале Універсітэта ў Беластоку ў рамках кірмашу прэзентавалася больш за сорак экспанентаў. Першую выстаўку, на якую я трапіў, падрыхтавала Згуртаванне гмін Верхняй Нарвы. Вельмі мілая пані, у якой я спытаўся аб прапановах для беларусаў, якія хацелі б наведаць іхні рэгіён, або ці жыхары Падляшша могуць разлічваць на дапамогу ў сарганізаваным турысцкім выездзе на Беларусь, адказала мне: „Такой спецыяльнай прапановыя ў нас няма. Але калі б было такое зацікаўленне, мы напэўна гатовы былі б дапамагчы". Ад гэтай пані атрымаў я буклеты, якія рэкламавалі не зусім дакладна турыстычныя прапановы, толькі культурныя ў Нараўчанскай гміне, прытым праводжаныя гадамі таму. Падобна было на стэндах павятовага староства з Сямятыч і Гміннай управы ў Мельніку, якія заахвочвалі прыехаць на байдарачны паход па Бугу, веласіпедную экскурсію на Святую Гару Грабарку ці экскурсію слядамі іконы Спаса Збавіцеля. Тут абодва самаўрады таксама не мелі прапаноў датычных трансгранічнага турыстычнага руху. Гэтаксама было і на стэндах турыстычных фірм. Дзякуючы ім можна запланаваць сабе летнія экскурсіі ў Егіпет, Грэцыю ці на Канарскія астравы і г.д., але ўжо ў Беларусь — не. Да наведвання заахвочвалі фірмы і ўстановы з Гданьскага Памор'я, Верхняй Сілезіі, а лакальныя — м.інш. падляшскія індзейцы да наведання іхняй падбеластоцкай вёскі. Разынкам здаваўся быць даведнік *Szlaki rowerowe w regionie Puszczy Białowieskiej: Polska — Białoruś*, які выдала Гайнаўскае староства. Намаўлялі да гасцявання падляшскія ўладальнікі гасцініц і — самае цікавае ў традыцыі Падляшскага турыстычнага кірмашу, якому ўжо за дзесятак гадоў — у масавым маштабе ўладальнікі турысцкіх кватэр. Звярнуў маю ўвагу адносна вялікі лік такіх начлежных месц у ваколіцы Нараўкі і Старога Ляўкова (тут нават у пані Ірэны Ігнацюк у рамках адпачынку можна паўдзельнічаць у ткацкім майстар-класе).

Я праходжваўся паміж стэндамі ў пошуках згаданых трансгранічных прапаноў. Мой зрок трапляў а то на касметалагічную фірму, а то на вытворцу мінералкі з Крынак, а то на льняныя мяшэчкі на слоікі і бутэлькі. Спыніўся я таксама перад жанчынай з беластоцкай Гарадской управы і ўзяў удзел у конкурсе, у якім ставілася пытанне: якія імёны былі ў графа Браніцкага? Я ведаў, што быў ён Ян Клемэнс, і выйграў кашульку са спорным лагатыпам „Узыходзячага Беластока". Урэшце маё вока спачыло на стэндзе Дэпартамента фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама. Дзве маладыя беларускія красуні ўручылі мне дужманы пакет каляровых буклетаў, выдадзеных таксама і па-польску: аб вясковых сядзібах Гродзеншчыны, аб Аўгустоўскім канале і яго беларускіх ваколіцах, санаторных цэнтрах у Беларусі, таксама і аб турыстычных шляхах у беларускай частцы Белавежскай пушчы. Прапанова здалася мне сапраўды імпазантнай. Тым не менш, выходзячы з кірмашу, дайшоў я да вываду, што хутчэй няма мне чаго разлічваць на дапамогу польскіх турыстычных фірм і ўстаноў, каб пакарыстацца тымі атракцыёнамі, што прадстаўляў гродзенскі дэпартамент. Калі б я даверыў ім час свайго адпачынку, бліжэй было б мне над Міжземнае ці Эгейскае моры, чым на падгарадзенскія азёры.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Так моладзь святкуе Дзень Волі!

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У асабліва святочным настроі праходзіў дзень 25 сакавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Раней штогод у гэтай школе адзначаліся ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі, а для белгімназістаў і белліцэістаў найчасцей ладзіліся асобныя лінейкі патрыятычнага характару. Бывала, што на спатканні з вучнямі запрашаліся гісторыкі і беларускія дзеячы. Гэтыя святкаванні былі і цікавымі, і адукацыйнымі, асабліва для першакласнікаў белгімназіі і белліцэя. Аднак маладыя людзі любяць мяняць характар мерапрыемстваў і таму арганізатары сёлетніх святкаванняў, якімі былі школьны Клуб беларускіх спраў і сам Гайнаўскі белліцэй, зрабілі ўпор на разнароднасць і рашыліся прыняць удзел у агульнабеларускай дыктоўцы, наладзіць дэманстрацыю беларускіх фільмаў і турнір, прымеркаваны да 91 угодкаў БНР.

Найбольш вучняў сабраў турнір, у якім прынялі ўдзел 4 школы: Бельскі белліцэй, Гімназія № 7 у Беластоку, Гімназія з Ягуштова і гаспадары — гайнаўскія белліцэісты. Турнір пачаўся з прэзентацыі моды. Паводле некаторых наглядальнікаў, гэтае спаборніцтва было самае цікавае. Усе каманды паказаліся ў адмысловых уборах, але справа была не толькі ў прэзентацыі вопраткі, але ў прадуманым акцёрскім выступленні. Найбольш арыгінальна паказалі сябе бельскія белліцэісты і беластоцкія гімназісты і менавіта яны атрымалі найбольш балаў. Адны і другія паказалі кіраўніка Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча як прадстаўніка даўняй эпохі і аматара хакея. Гульцамі ў хакей, які зараз стаў беларускім нацыянальным спортам, паказаны былі таксама Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Якуб Колас і журналістка нашага тыднёвіка Ілона Карпюк. Апошняя была членам турнірнага журы, разам з гісторыкам Алегам Латышонкам і праграмным дырэктарам радыё „Рацыя" Яраславам Іванюком. Цікава паказвалася таксама „Пагоня" і карыкатура цяперашняй вопраткі. Маладыя беларусы павінны ведаць гісторыю свайго народа, а рыхтуючыся да турніру павінны былі засвоіць веды аб Беларускай Народнай Рэспубліцы. Аднак гістарычныя пытанні былі настолькі дэталёвымі, а адказы ў агульным правільнымі, што здзівілі, як камісію, так і журналістаў. Калі б большасць нашых белліцэістаў і белгімназістаў была так добра зарыентаваная ў гісторыі беларускіх зямель, трэба было б толькі радавацца.

— 25 Сакавіка — вельмі важны дзень для ўсіх, хто адчувае сябе беларусамі. Кожны беларус павінен праводзіць гэты дзень на свой спосаб урачыста, як у Беларусі, так і па-за яе межамі. Турнір, гэта цікавая формула, якая заахвочвае маладых актыўна праводзіць святочны дзень, — гаворыць Кася Янцэвіч з Гайнаўскага белліцэя.

Актыўнае правядзенне святкаванняў станоўча ацаніла Юліта Нікалаюк з Гімназіі № 7 у Беластоку.

— У Падставовай школе мы гаварылі вершыкі і рыхтавалі сцэнкі, прымеркаваныя да Акту 25 Сакавіка, а зараз прымаю ўдзел у новай формуле, якая патрабуе яшчэ большай актыўнасці. Аднак гэта такое свята, што трэба яго адзначаць, — кажа Юліта Нікалаюк.

Бельскія белліцэісты прыехалі з бел-чырвона-белымі сцягамі

Важнай, у сэнсе эмацыянальнай прывязанасці маладых людзей да традыцыі, было спаборніцтва, у час якога вучні елі нацыянальнае харчаванне беларусаў — бульбу, а дакладней кажучы таўканіцу. Член камісіі Яраслаў Іванюк заўважыў, што найхутчэй праглынуць таўканіцу і выразна перамагчы іншыя каманды гайнаўскім белліцэістам дапамагла добрая тэхніка. Аднак немалую ролю ў іхняй перамозе магла сыграць сталовая гайнаўскага белліцэя. Яе працаўніцы — людзі добразычлівыя і штодзень не шкадуюць вучням таўканіцы, бо ж на бульбе стаяла і стаіць уся Гайнаўшчына. Настаўнікі напамінаюць ліцэістам, каб пасля абеду не спазняліся на ўрокі і таму моладзь навучылася хутка есці таўканіцу. Спаборніцтвы ў час турніру былі толькі падвядзеннем вынікаў шматгадовай трэніроўкі.

У галіне плакатаў найбольш балаў набралі гайнаўскія белліцэісты, паказваючы „свабоду" ў выглядзе партрэта прэзідэнта РБ, і ягуштоўскія гімназісты, якія, прэзентуючы Мінск, побач будынкаў паказалі матацыкл „Мінск" (аб якім мала і чула маладое пакаленне). У час танцавальных спаборніцтваў, якія пад музыку „Лявоніхі" ўдала вяла Анна Галашэвіч, перамаглі бельскія і гайнаўскія белліцэісты. Аднак вырашальнымі ў цэлым турніры былі музычныя спаборніцтвы, у час якіх можна было атрымаць найбольш балаў. Музычныя здольнасці і добрую арыентацыю ў беларускай музыцы паказалі беластоцкія белгімназісты, якія перамаглі ў турніры, набіраючы 45 балаў. Пасля спаборніцтваў іх вакальна-інструментальны калектыў (яго мастацкім кіраўніком з'яўляецца Ілона Карпюк) выступіў з кароткім канцэртам. Другое месца занялі бельскія белліцэісты (набралі 40 балаў). Выступілі яны з прыгожым белым спевам. Ягуштоўскія гімназісты (занялі чацвёртае месца, набраўшы 34,5 бала) зацікавілі публіку музычнай інтэрпрэтацыяй радкоў „Новай зямлі" Якуба Коласа, спяваючы разам з настаўнікам беларускай мовы Ігарам Лукашуком пад гітару і акардэон. Цікавую, на свой спосаб, інтэрпрэтацыю радкоў Якуба Коласа даў гайнаўскі белліцэіст Пётр Петручук (Гайнаўскі белліцэй заняў трэцяе месца, набраўшы 35 балаў). Гайнаўская школа мела б шанц нават перамагчы ў турніры, калі б уключыла салістак са „Знічкі", бо калектыў бельскіх белліцэістак абапіраўся на „Жэмэрву", а беластоцкіх гімназістак — на членаў вакальна-інструментальнага калектыву „Клюквы" (хаця апрача добрага голасу, трэба было яшчэ ведаць сучасныя беларускія песні).

Пераможцамі турніру сталі беластоцкія гімназісты

Гайнаўскія белліцэісты (на першым плане) умомант праглынулі таўканіцу

Пасля падвядзення вынікаў дырэктар Гайнаўскага белліцэя Яўген Сачко ўручыў беластоцкім пераможцам драўляныя статуэткі зуброў. Астатнія ўдзельнікі турніру атрымалі сувеніры.

— 25 сакавіка — Дзень Волі — вельмі важны ў жыцці кожнага беларуса. У нашай школе турніры ў гэты дзень ладзяцца здаўна і ўдала заахвочваюць да гульняў, — заяўляе бельская белліцэістка Кася Бабулевіч.

— Пра 25 Сакавіка мы гаворым на ўроках. Гайнаўскі турнір — добрая нагода, каб нашых гімназістаў увесці ў святочны настрой, — гаворыць настаўнік беларускай мовы Ягуштоўскай гімназіі Ігар Лукашук.

Святкаванні ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы пачаліся а восьмай гадзіне раніцы, калі па двух вучняў з кожнага класа белгімназіі і белліцэя прыступілі да агульнабеларускай дыктоўкі, арганізаванай Таварыствам беларускай мовы на падставе фрагментаў „Роднай мовы" Уладзіміра Караткевіча. Паводле настаўнікаў беларускай мовы Яна Карчэўскага і Іаланты Грыгарук, якія правяралі работы, самай складанай для гайнаўскіх вучняў аказалася пунктуацыя. Аднак у гэтым спаборніцтве самым важным было выклікаць пашану да роднай мовы, як у самой Рэспубліцы Беларусь, так і сярод беларусаў замежжа, а дата правядзення дыктоўкі невыпадкова была прымеркаваная да сакавіцкіх святкаванняў. У святочным настроі адбылася таксама дэманстрацыя фільмаў Міколы Ваўранюка „На ростанях" і „Gloria victis", у час якой быў прысутны аўтар стужак. Галоўны арганізатар святкаванняў, настаўнік гісторыі Яўген Янчук і заадно апякун Клуба беларускіх спраў адзначыў, што гульні ў час нацыянальнага свята даюць магчымасць больш эфектыўна зацікавіць моладзь гістарычнымі падзеямі і сённяшнімі беларускімі справамі. Гайнаўскі белліцэй быў абклеены плакатамі, прымеркаванымі да святкаванняў Акту 25 Сакавіка, што яшчэ больш узмацняла святочны настрой.

Рыначны крызіс

Крызіс спасціг гандаль. Гаспадарчае прытармажэнне паўплывала на зніжэнне спажывецкага попыту. Таннеюць мэбля, аўтамабілі, электратэхніка, а нават спажывецкія прадукты, якімі не карыстаемся штодзень. Павышаюцца затым кошты прадпрымальнікаў. Трэба плаціць больш за арэнду памяшканняў, электраэнергію і газ. Вытворцы і купцы зніжаюць гандлёвыя нацэнкі, каб прыцягнуць кліентаў. А гэтых, як на лякарства. Пакупнікоў больш цікавіць цана, чым якасць тавару. Кожны шукае нагоды, каб танней купіць. Калісьці на чаромхаўскім рынку збіралася процьма народу. Пляцоўка за гандлёвым павільёнам была набітая пакупнікамі і гандлярамі. А зараз паміж прылаўкамі гуляй „на ўсю Іванаўскую". Напрыканцы сакавіка самыя адборныя яблыкі каштавалі ад 50 грошаў да 1,30 зл. за кілаграм. Гэтага напрадвесні не бывала.

— Трэба будзе садок ліквідаваць, — гаварыў агароднік з Плятарова, які прыязджае з садавіной на рынак у Чаромху. — Хімікаты даражэюць. Па загадзе еўрасаюзных устаноў адмянілі нам засцерагальныя сродкі для апырсквання, якімі мы дагэтуль карысталіся, бо быццам бы яны шкодныя для здароўя. Казалі карыстацца менш эфектыўнымі, затое даражэйшымі. А справа фруктаў? Айчыннаму агароднику плацяць 0,50-1,00 зл. за кілаграм, калі за галандскія яблыкі трэба ў краме заплаціць 6,50 зл. Коштам нашым нажываюцца гандлёвыя пасярэднікі. Шафёр аўтафуры хваліўся, што з адной паездкі з яблыкамі ў Расею атрымліваецца яму дзве з паловай тысячы долараў прыбытку. Падобных прыкладаў можна больш прыводзіць, але гэта будзе анульнавядомая вада на млын.

Па ацэнцы аналітыкаў цяперашні гандлёвы крызіс вытрымаюць не моцныя ды „інтэлігентныя" адзінкі, але тыя, хто хутка зможа прыстасавацца да сучаснай рэчаіснасці.

Уладзімір СІДАРУК

Пост — вясна для душы

Што трэба для сапраўднага свята душы? Па-першае, неабходна разумець сэнс свята, яго гісторыю. Падругое, сур'ёзная падрыхтоўка. У праваслаўнай традыцыі такой падрыхтоўкай служыць пост, час асаблівай увагі да свайго душэўнага стану. Гэта як на іспытах: калі ты падрыхтаваўся, то атрымаеш добрую адзнаку, а калі не — сам вінаваты.

Пост — гэта вясна для душы. Ён робіць пачуцці больш успрымальнымі да духоўнай радасці, дапамагае ачысціць цела і душу. Хто прытрымліваецца ўсіх царкоўных постаў, ведае як пасля іх нібыта маладзее.

Але ж пост без малітвы можа дрэнна ўздзейнічаць на чалавека. Святы Ігнацій Бранчанінаў у адным са сваіх твораў параўноўвае пост з узорваннем глебы. На добрай глебе добра растуць не толькі карысныя расліны, але і пустазелле, таму ў час посту трэба асабіста ахоўваць душу ад кепскіх уражанняў, не гневацца, як звычайна робяць галодныя людзі, прабачаць крыўды, рабіць справы міласэрнасці, часцей хадзіць у храм Божы, маліцца ў хаце. Толькі тады мы будзем адчуваць сапраўднае свята ў нашай душы.

Дзед ДАНІЛА

Гарадок: Яновіч у Літаратурным атласе

На Дзень Волі, 25 сакавіка, у Гмінным цэнтры культуры ў Гарадку ўрачыста прайшла прэзентацыя працы гарадоцкіх гімназістаў, у прысутнасці героя, пра якога збіралі яны матэрыял у „Літаратурны атлас Польшчы". Што важная была гэта падзея сведчыць таксама тое, што апрача вучняў і іх настаўнікаў на гэтае своеасаблівае адзначэнне патрыятычнага свята прыбылі таксама ўлады гміны.

— Наша сустрэча адбываецца невыпадкова сёння, бо сёння незвычайная дата, — тлумачыў маладым дырэктар ГЦК, іначай Дома культуры імя Кастуся Каліноўскага, Юрка Хмялеўскі. — Для беларусаў гэта вельмі важная дата, нацыянальнае свята. Спалучылі мы гэта з падвядзеннем вынікаў праекта, у якім прыняла ўдзел гарадоцкая моладзь — „Літаратурнага атласа Польшчы".

— Гэты праект рэалізавалі мы з чэрвеня мінулага года, — адзначыла настаўніца Ірэна Матысюк. — Пачалося з сустрэчы з прадстаўнікамі Цэнтра грамадзянскай адукацыі на літаратурных майстар-класах. У час гэтых заняткаў моладзь вучылася рыхтаваць старонку „Літаратурнага атласа Польшчы". Нашым наступным дзеяннем быў выезд да спадара Сакрата Яновіча ў Крынкі (невялікая група ездзіла туды са спадарынямі Эляй Раманчук і Ганнай Кандратовіч), пасля ў кастрычніку сустрэліся мы ўсе з пісьменнікам у Крынках. Маглі мы паразмаўляць з аўтарам пра яго жыццё і творчасць. Стварылі мы прэзентацыю асобы і творчасці пісьменніка, якую прадставяць Дарота, Беата і Ева. Праект рэалізаваўся дзякуючы пані Ані Кандратовіч, якая з'яўляецца галоўным рэалізатарам праекта. Падтрымлівалі мы яе — я, пані Эля Раманчук і іншыя настаўнікі.

На электроннай прэзентацыі прадстаўлены Сакрат Яновіч як творца і чалавек, паказаны ягоныя здымкі і фрагменты тэкстаў па-беларуску і ў перакладах, а таксама выказванні іншых пра ягоную творчасць і ролю аўтара ў грамадстве. „Пісаць магу толькі пабеларуску, паколькі мая ўява чэрпае з залежаў гэтай мовы — мовы майго дзяцінства і пачуццяў", — прыводзяцца выказванні героя з яго тэкстаў і з размоў, праведзеных моладдзю ў час сустрэч у Крынках. Пад загалоўкамі бачынак (напр., „Пошукі сваёй нацыянальнай тоеснасці") — вывады: „Сакрат Яновіч — з дзеда-прадзеда беларус, выхаваны ў культуры сваіх продкаў. Даўней у Крынках жылі палякі, беларусы, яўрэі, а ў блізкіх Крушынянах — татары. Праваслаўе крыжавалася з каталіцызмам, а мячэць была суседкай яўрэйскай бажніцы. Як сцвярджае наш герой: „Я стаў беларусам у Беластоку, а не ў Крынках; там былі толькі свае". „Да беларушчыны ніколі больш не дайшоў бы, калі б не цікавілі мяне кнігі". Пра „Сярэбранага ездака": трохі міфалогіі, каб звесці цэнзуру. Вучняў гарадоцкай школы цікавілі таксама сувязі Яновіча з Гарадком і Гарадоччынай. Не ўвесь багаты матэрыял, сабраны імі, апынецца ў агульнапольскім літаратурным атласе. Збор матэрыялу і яго арганізацыя мела таксама адукацыйнае і культурнае значэнне для саміх вучняў. Таксама прэзентацыя была нагодай для размовы аб патрыятызме ды тоеснасці і рэфлексіі над гэтай тэмай у гэты важны для беларусаў дзень.

— Дзеці жыва рэагавалі на мае выказванні, значыць, паміж імі была дыскусія, — заўважыў Сакрат Яновіч, які меў з сабою сваю новую кнігу „Хатняе стагоддзе". Нядаўна ў ГЦК адбылася яе прэзентацыя пад лозунгам „Не! — выкараненню". — Я стараюся пісаць рэалістычна. Я баюся ствараць ілюзію. Гаворачы пра тоеснасць, я меў на ўвазе лёс пакалення. Тоеснасць паяўляецца ў чалавеку ад культуры. Калі ён будзе асобай культурнай, то ў яго рэфлексія або думка хто я і адкуль я — будзе. А калі чалавек не мае гэтай культуры, калі ёсць такі заядлы на грошы, на тое каб разбагацець, такія людзі далёка не заходзяць. Яны нават і не разбагацеюць, бо ўсё мае сувязь з чалавекам, з яго разуменнем свету. Ну, калі хтосьці не разумее свету, то ён будзе тым, аб чым я гаварыў на сустрэчы — парабкам. Парабкі заўсёды вельмі многа працуюць, але не багацеюць. Багацеюць тыя, што маюць больш розуму, інтэлекту, развагі. Словам — культура ёсць умоваю таксама багацця.

Міра ЛУКША

Недаступны „Супрасльскі ірмалагіён"

— Кампакт-дыск „Irmologion Supraski" — рарытэт, такога другога няма ў краіне, — кажа Барбара Баярын-Казбярук, віцэ-шэф Радыё Беласток. На ім дваццаць твораў у выкананні манастырскіх, царкоўных і свецкіх хароў з Супраслі, Грабаркі, Вайнова, Беластока, Масквы, Грэцыі. Іх чарговасць пастаўленая паводле парадку царкоўнай багаслужбы.

— Тут і архіўная каштоўнасць, — адзначае рэпартажыст Ян Смык, ініцыятар і рэдактар запісу. — Некаторыя хары ўжо не існуюць.

Матэрыял для дыска таленавіты рэпартажыст (родам з Дабрывады) збіраў цягам дзевяці гадоў. Многія запісы выконваліся ў час царкоўных набажэнстваў. Першы на дыску твор: „Да исправится молитва моя" выконвае жаночы хор Манастыра свсв. Марыі і Магдаліны на Святой Гары Грабарцы, асноўная частка: „Литургия верных" (16,54 хвілін) запісаная ў царкве св. Іаана Багаслова Дабравешчанскага манастыра Прасвятой Дзевы Марыі ў Супраслі, апошні твор: „Хвалите Господа" выконвае Мужчынскі манастырскі хор з той жа Супраслі. Дыск стрымлівае малітоўны характар, уражвае прыгажосцю і тэрапеўтычным характарам (у фоне часта чутны аздараўленчы кашаль вернікаў). Запіс вылучаецца старанай тэхнічнай апрацоўкай, дзякуючы якой 20 розных па якасці выкананняў кампазіцый зліваецца ў адзін непарыўны твор...

„Супрасльскі ірмалагіён" — музычны рукапіс, састаўлены ў 1598-1601 гадах у Супрасльскай лаўры вольнанаёмным спеваком з Пінска Багданам Анісімовічам. Мелодыі,

запісаныя на 576 старонках, самі сабой уяўляюць багаты зборнік музычных традыцый тагачаснага праваслаўнага свету. Сустрэнем там знаменныя, мірскія, грэчаскія, канстанцінопальскія, балгарскія, і супрасльскія мелодыі. Асаблівасць дакумента заключаецца таксама ў спосабе запісу. На думку даследчыкаў, гэта самы старажытны помнік музычнай літаратуры, запісанай паводле заходняй сістэмы (нотна-лінейнай натацыі).

— У супрасльскіх мелодыях знаходзім першыя ў царкоўнай музыцы партытуры на галасы, — адзначае музыколаг Марцін Абійскі.

Выданне прымеркаванае да 65-годдзя вяшчання Польскага Радыё Беласток і, так сказаць, наносіць карэктуру ў культурную палітыку рэгіёна. „Супрасльскі ірмалагіён" амаль невядомы на радзіме. Да гэтай пары, як адзначылі выдаўцы, у свеце выйшла ўжо 8 кампакт-дыскаў. На манер „Супрасльскага ірмалагіёна" вядуцца багаслужбы ў жаночым манастыры ў Екацерынбургу (Расія).

Заняпад музычнага помніка на радзіме наступіў у палове XVII ст. Яго новае адкрыццё адбылося ў 1970-х гг. Помнік быў знойдзены маскоўскім музыколагам Анатолем Канатопам. Датай сімвалічнага вяртання ірмалагіёна на бацькаўшчыну лічыцца 23 мая 1999 г., калі ў Супрасль завітаў, пабываючы на Фестывалі царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, Мужчынскі манастырскі хор св. Данілы з Масквы. Літургія была запісаная і выдадзеная ў форме аўдыё-касеты. Зараз, на ўзор супрасльскіх мелодый, што выдатна ілюструе дыск, паасобныя творы з ірмалагіёна выконваюць падляшскія (у тым ліку жаночыя) манастыры. Традыцыя адраджаецца найперш у самім Супраслі.

— У гэтым заслуга дыякана Дзмітрыя Тыханюка, дырыжора прыхадскіх і манастырскіх хароў, — адзначае Марцін Абійскі.

На сённяшні дзень па ірмалагіёне служыцца літургія па пятніцах (пачатак у восем гадзін раніцы). Нядаўна таксама быў заснаваны Мужчынскі вакальны гурт імя Багдана Анісімовіча (пад кірункам Марціна Абійскага).

Пры дапамозе выдання Радыё Беласток хоча прамаваць рэгіён. На жаль, кампакт-дыск недаступны на рынку, паколькі выйшаў тыражом толькі ў тысячу асобнікаў. Экземпляры найперш патрапяць у рукі далейшых прамотараў...

Аднак самыя настойлівыя фанаты „Супрасльскага ірмалагіёна" могуць звязацца з рэдакцыяй Радыё Беласток і „запісацца" на дыск. Выдаўцы просяць кантактавацца па электроннай пошце: *radiobia@radio.bialystok.pl*

Ганна КАНДРАЦЮК

** Irmologion Supraski, 2008 Radio Białystok S.A. Redakcja: Jan Smyk. Projekt szaty graficznej: Ewa Zalewska*

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА



З боку Вышак

Былая школа ў Малешах

(працяг з 13 н-ра)

Ад Шпакоў да Малешаў каля кіламетра асфальтоўкі. Першым аб'ектам па гэтай дарозе ў Малешах з'яўляюцца будынкі былога эскаэра. У 2005 годзе гміна прадала іх за амаль пятнаццаць тысяч злотаў. Цяпер эскаэраўскі пляц абгароджаны, але нейкай дзейнасці за той агароджай яшчэ не відаць. Хаця да асноўнага будынка дабудаваны другі паверх, устаўлены новыя вокны.

Выгляд вуліцы ў Малешах можа выклікаць пачуццё дэпрэсіі не толькі ад снегавога балота на бруку. Яшчэ чатыры гады таму працавала тут крама; цяпер яна мёртвая. Побач крамы ветраецца наўсцяж драўляны будынак былой вясковай святліцы. Бадай адзіным пунктам малешаўскай вуліцы, які падымае настрой, з'яўляецца акуратна задбаны мураваны будынак былой школы, але ён зімою пусты. Калі я чатыры гады таму назад размаўляў з гаспадарамі Малешаў, яны сказалі мне, што калі войт прадаваў іхнюю школу, дык абяцаў, што выручаныя тут грошы зноў сюды вернуцца. Школа прададзена, прададзеная эскаэраўская маёмасць, але не відаць, каб гэтую выручку гмінныя ўлады ў Вышках вярнулі ў Малешы, Малешам астаюцца толькі абяцанкі. Дарэчы, калі б глянуць і з пазіцыі войта, дык цяжка было б здагадацца, на што тую выручку прызначыць.

Бо Малешы пусцеюць. Лічаныя гаспадары яшчэ трымаюцца сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак каля паловы хат у вёсцы пустуе ў зімовы перыяд. Варта тут прыгадаць, што пасля вайны Малешы пакінула амаль трыццаць сем'яў, выязджаючы ў Савецкі Саюз, галоўным чынам у Беларусь. Людзі выязджалі са спаленай у выніку ваенных дзеянняў вёскі і ў выніку агітацыі, і дзеля ратунку ад пасляваеннага тут насілля.

Хацелася б нешта напісаць і пра малешаўскую арыгінальнага дызайну царкву, аднак маю з гэтым клопат. Калі на сайце Драгічынскай дыяцэзіі прысутнічаюць даволі аб'ёмістыя інфармацыі пра ўсе яе парафіі, касцёлы і капліцы, то пра сайт Варшаўска-Бельскай епархіі такога няма як сказаць; старонка адведзеная Малешаўскаму прыходу толькі фармальная. А магла б яна быць запоўнена цалкам прыстойным зместам, бо ж за апошнія сто пяцьдзесят гадоў тут напорыста тварылася прыхадская гісторыя... Цяперашняя царква з'явілася ў Малешах пасля другой сусветнай вайны, у час якой згарэла царква, пабудаваная ў 1870-х гадах. І стаіць яна на іншым месцы чым ранейшая...

Крайнія хаты Берасцянкі паказваюць, што людзі тут яшчэ хочуць трымацца зямлі. А вось у недалёкім Лубіне-Рудолтах крыху хат хіліцца...

Парафіяльны Лубін у XV стагоддзі называўся Рудолтавам. У палове таго ж стагоддзя ўласнікам вёскі стаў Ян Луба, якога сын Пётр, бельскі суддзя, узвёў у 1498 годзе драўляны касцёл, які прастаяў — праўда, не надта спакойна, 512 гадоў — аж да 1910 года, калі быў пабудаваны цяперашні, мураваны касцёл. Гэта дзеля інфармацыі, бо ў Лубіне-Рудолтах я ў бок касцёла не пайшоў, толькі падаўся ў напрамку Стрыкоў. Жвіроўка паміж гэтымі вёскамі амаль увесь час лесам, частка якога пасаджана ўжо ў нашым новым стагоддзі.

Адкуль узялася назва Стрыкі? Надта ўпэўнена меркаваць не буду, аднак словам „стрык", якое прывандравала да нас з нямецкай мовы, калісь называлі вяроўку. У палескай лексіцы гэтае слова і абазначала канат, якім звязвалі задок з перадком воза; магчыма, што вёска і славілася выплятаннем такіх стрыкоў. Але варта яшчэ заўважыць, што гэтае слова ў польскай мове мае яшчэ іншае значэнне: вяроўкі, якой карыстаўся кат. Вёска Стрыкі распаложана па дарозе, што злучала Бельск з Браньскам, гарадамі, у якіх дзейнічалі суды, якія калісь судзілі вельмі строгія прыгаворы. У Браньску восенню 1628 года тамашні суд за адзін дзень засудзіў да найвышэйшай меры пакарання аж дваццаць шэсць шляхцічаў! Праўда, стрыком шляхцічаў не каралі, каралі ім ніжэйшыя саслоўі, да якіх — можна здагадвацца — тутэйшыя суды былі не менш строгія. Стрыкі былі патрэбныя, і то якасныя, ці то ў Бельску, ці ў Браньску. І найзручней было іх хіба вырабляць недзе між гэтых гарадоў...

У Стрыкі вяла мяне цікавасць да помніка, які каля гэтай вёскі пастаўлены ў памяць паўстанцам 1863 года. Пабачыўшы на адным з панадворкаў жанчыну, я і завёў гутарку пра той помнік. Ён крыху далекавата ад Стрыкоў, у лесе з боку Нявіна, і мая суразмоўніца не рэкамендавала мне туды хадзіць у мокра-снежнае надвор'е, але запрашала ў лепшую пагоду, калі ейны муж мог бы нават завезці туды самаходам. А пакуль завяла мяне да свайго бацькі, Рыгора Краўчука, стрыкоўскага старажыла.

Каплічка ў Стрыках

Спытаў я спадара Краўчука пра лес, што прылягае да Стрыкоў з боку Лубіна — калі ён там з'явіўся; бо мне падалося, што ён пасляваеннай метрыкі і вырас на пакінутых мігрантамі ў СССР грунтах. Аднак справа з гэтым лесам выглядае інакш: тут раней быў агульны вясковы ўчастак, на якім рос лес. Пасля камасацыі ў 1937 годзе той лес высеклі і на яго месцы вырас чарговы сасновы самасей. А пасля вайны са Стрыкоў у СССР выехала толькі тры рэпатрыяцыйныя суб'екты: Рыгор Сычэўскі — апазіцыянер санацыйным уладам — з сям'ёй, адна жанчына з сынам і адна дзеўка. Сама вайна забрала з жыцця шасцярых жыхароў Стрыкоў; траіх з іх памерла ў лагернай няволі ў Камарове каля Астровi-Мазавецкай.

Ад спадара Краўчука даведаўся я і іншых сумных вестак. Два гады таму адышоў у лепшы свет стрыкоўскі іканапісец-самавук Ян Шымковіч, пра якога пісалі мы на ніўскіх старонках. І са стрыкоўскага краявіду знік вятрак, які нашчадкі ўласніка некуды прадалі.

У канцы вёскі з боку Ягуштова стаіць капліца, якая мае сваю легенду. Калісь на яе месцы стаяла фігура святога Яна, якой злякаўся конь нейкага чыноўніка, што ехаў Бельскім гасцінцам — з Бельска ў Браньск. Конь знатурыўся і панёс пасажыра. І той чыноўнік пасля загадаў знесці тую фігуру. Пасля вяскоўцы калядавалі і зарабілі грошы, за якія захацелі паставіць капліцу. Збудаваў яе Станіслаў Васкевіч, мясцовы католік жанаты з праваслаўнай...

У лесе паміж Стрыкамі і Ягуштовам могілкі, а на іх капліца. І перад могілкамі абшырная трохмоўная інфармацыя пра аб'ект. І ў Ягуштове кірылічныя ўказальнікі да тамашніх урочышчаў. І ў інтэрнэце шмат пра Ягуштова. І, здаецца мне, што ўся гэтая інфармацыйная актыўнасць трымаецца на адным энтузіясце мясцовай даўніны са Студзіводаў. А паколькі мне толькі здаецца, то ягонага прозвішча не буду тут называць...

Падыходжу зноў да бельскага вакзала, гляджу ў бок чыгуначных перонаў ці няма на іх поезда; не відаць. Заходжу ў пачакальню, а з ёй поезд відаць на пероне зараз за акном. У Беласток той рэйкабус і забіраюся на яго. Пасажыраў крыху больш за чатыры асобы кандуктарскага экіпажа. На прыпынку Райск поезд спыняецца на некалькі хвілін. Экіпаж рэйкабуса дружна выходзіць на перон на перакур. Цікава паездзіць па свеце.

Святкаванне Дня Волі ў Нью-Йорку

22 сакавіка перад будынкам штабкватэры ААН у Нью-Йорку адбылася святочная акцыя, прымеркаваная да 91-х угодкаў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Беларускі моладзевы рух Амерыкі сабраў разам маладых беларусаў з Нью-Йорка, Нью-Джэрсі і Вашынгтона пад лозунгамі абароны незалежнасці краіны. Удзельнікі дэманстрацыі праспявалі гімн „Магутны Божа". Потым быў зачытаны зварот старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілы да беларускага народа.

У гэты ж час у Кафедральным саборы св. Кірылы Тураўскага Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Брукліне праходзіла святочнае багаслужэнне.

А 13-й гадзіне ў Беларускім музеі ў Нью-Йорку адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы „Мастацтва супраць дыктатуры", якая раней была паказана ў эстонскім парламенце і ў штаб-кватэры German Marshall Fund у Вашынгтоне. Прагучалі „Мы выйдзем шчыльнымі радамі", „Магутны Божа", а таксама вершы пра Беларусь. Старшыня Парафіяльнай рады Кафедральнага сабора св. Кірылы Тураўскага Расціслаў Гарошка правёў экскурс у мінулае. Ён звярнуўся да гісторыі найважнейшых для Беларусі падзей 25 сакавіка 1918 года. Алесь Шатэрнік, вядомы беларускі дзеяч культуры і мастацтва, распавёў пра творчасць беларускіх мастакоў Алеся Марачкіна, Міколы Купавы, Рыгора Батальёнка, Генадзя Драздова, Юрыя Платонава, Янкі Рамановіча і Юліі Шатэрнік. Упершыню ў Беларускім музеі ў Нью-Йорку выстаўляліся працы цікавай беларускай мастачкі Алены Тылькінай. Таксама з прамовай выступіў адзін з дзеячаў царкоўнай рады Мікалай Сагановіч. Выступоўцы казалі аб тым, што для іх асабіста значыць дзень абвяшчэння суверэнітэту Беларускай Народнай Рэспублікі. Пасля адбыўся прагляд дакументальна-публіцыстычнага фільма рэжысёра Уладзіміра Коласа „Галерэя Ады". Стужка прысвечана дзяячцы беларускага нацыянальнага адраджэння, старшыні Германавіцкага культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча Адзе Райчонак. На свае сродкі яна заснавала мастацкую галерэю ў вёсцы Германавічы Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці і рэгулярна праводзіць пленэры з удзелам беларускіх і замежных мастакоў. Героямі фільма з'яўляюцца вядомыя жывапісцы і графікі, у тым ліку Рыгор Скрыпнічэнка, Аляксей Марачкін, Янка Рамановіч, а таксама жыхары вёскі Германавічы.

Дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. — гэта самая значная падзея XX стагоддзя для беларускай дзяржавы і беларускага народа.

Жыве Беларусь!

Наталля РАБАВА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Роднае і народнае слова ў Беластоку

Ад шматлюднага „Роднага слова" ў Беластоку запамятаўся Гарадок. І не ідзе тут пра іх мастацкае выступленне. Ярказ я згодна (па-за адным выключэннем) з ацэнкай камісіі (Альжбета Фіёнік, Іаанна Васілюк, Яніна Плютовіч). Дэкламатары з Гарадка ўразілі як лакальныя патрыёты. Амаль усе выступілі з вершамі гарадоцкага паэта Анатоля Парэмбскага. Спачатку, калі я пабачыла ў спіску шэсць выканаўцаў з вершамі народнага паэта, пабаялася паўтораў. Атрымалася зусім іншае. Кожны з удзельнікаў падабраў верш сабе па густу. Хто гаварыў пра гульбішчы ў славутым Барыку (там адбываецца „Басовішча"!), хто пра пустую хатку бабулі, хто пра Супрасльскую лаўру. Лукаш Зіневіч прапанаваў сустракацца з людзьмі (верш: „Выкідайце тэлевізар!"). А Іаанна Паплаўская распавяла пра народныя абрады (верш: „Шчодры вечар"). У выніку атрымалася маляўнічая карціна іх роднага куточка. І можна сказаць, што выступленне Іаанны Паплаўскай было самым прыгожым і эфектоўным момантам шасцігадзіннага конкурсу. Яе выступленне атрымала найбольшыя апладысменты.

— Раней я распытала пра абрады бацьку, — кажа Іаанна. — Ён пацвердзіў, што сапраўды было так, як напісаў паэт.

Дэкламатарцы спадабаліся словы, якімі карыстаецца паэт. Іаанна цікавіцца мовамі і вывучае ўсе, якія выкладаюцца ў іх школе.

Іаанна Паплаўская

— Ты ведаеш аўтара?

— Вядома, усе мы ведаем пана Парэмбскага, — кажа Іаанна.

— Як адчувае сябе дэкламатар, калі выступае з творам чалавека, так сказаць, з суседства?

— Гэта дзіўна, але прыемна. Дзень раней мы выступалі ў Гарадоцкім доме культуры ў прысутнасці аўтара. Здаецца, пан Анатоль на нас не пакрыўдзіўся.

Асабіста лічу, што адносіны да чалавека і твораў адлюстроўваюць нашы адносіны да твораў і мовы. Старанная падрыхтоўка сама гаворыць за сябе.

Пра гэтую справу напамінала старшыня камісіі Альжбета Фіёнік.

— Просім настаўнікаў звяртаць увагу на націскі і вымаўленне, — сказала яна ў час падвядзення вынікаў.

Сапраўды, сярод мора выступоўцаў (на сцэне паказалася 155 удзельнікаў — прытым многія адсутнічалі!) было шмат недапрацовак. Склалася ўражанне, што прыехалі ўсе, хто паспеў заняць месца ў аўтобусе. Пазітыўна вылучаліся адно

Лена і Соня Сульжыкі з татам

дэкламатары ў катэгорыі класаў I-III з беластоцкай „чацвёркі". Уразілі таксама два сямейныя дуэты: Лена і Соня Сульжыкі з Гарадка ды Магдаліна і Міхась Бабікі з Беластока. А прыгожае выступленне Кубы Андрацкага з Саколкі, які выступіў з апавяданнем Кастуся Кірэенкі „Няма нічога ў свеце даражэй", закранула душу.

Сёння падаем спісак лаўрэатаў першага месца:

Гран-пры: Міхась Бабік з ПШ № 4 у Беластоку.

У катэгорыі: дашкольнікі: Ксеня Клімюк, Вікторыя Пякарская з Прадшколля № 14 у Беластоку, Соня Сульжык з Гарадка. У катэгорыі класаў I-III: Юлія Кузыка з Непублічнай пачатковай школы ў Беластоку, Янка Іванюк, Якуб Цішук, Адрыянна Бакер з ПШ № 4 у Беластоку; у катэгорыі класаў IV-VI: Якуб Андрацкі з Саколкі, Магдаліна Бабік і Дар'я Вапа з ПШ № 4 у Беластоку.

Сярод гімназістаў першае месца заняла Аксана Сычэўская з Гімназіі № 7 у Беластоку.

Раённы адбор конкурсу „Роднае слова" адбыўся 24 сакавіка ў памяшканні БГКТ у Беластоку. Арганізатар мерапрыемства Таварыства беларускай

Міхась Бабік

культуры прыдбала класныя ўзнагароды — талоны ў кніжны магазін. Узнагароды атрымалі лаўрэаты першых трох месцаў і тыя, якія атрымалі вылучэнне. А іх лік быў сапраўды вельмі вялікі.

Цэнтральны конкурс неўзабаве — 8 красавіка ў Нараўцы.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Музыка з кайфам

Голас салідарнасці

Фота Ілоны КАРПЮК

Тыдзень таму ў рубрыцы „Музыка з кайфам" распавяла я пра песні, якія можна назваць гімнамі, песнямі свабоды, сучаснымі музычнымі сімваламі Беларусі. Хачу працягнуць тэму, але крыху ў іншым кантэксце. Неаднойчы згадвала я пра музычныя падзеі, канцэрты і фестывалі. Думаю, трэба ўспомніць і польскую ініцыятыву, накіраваную да польскага і беларускага грамадства. Мерапрыемства называецца „Салідарныя з Беларуссю" і ўжо чатыры разы прайшло яно на пляцах польскай сталіцы.

Канцэрт узнік пры нагодзе прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў 2006 годзе і яго мэтай было паказаць салідарнасць палякаў з беларусамі, якія „пражываюць у недэмакратычнай дзяржаве, дзе няма свабоды слова". Канцэрт, паводле арганізатараў, патрэбны таму, каб не толькі паказаць салідарнасць, але таксама пашырыць веды польскага грамадства аб Беларусі. А інструментам для гэтага мае быць музыка. Таму кожны год на канцэртнай сцэне становяцца побач сябе вядомыя польскія выканаўцы ды беларускія музыкі. Праўда, беларускіх слоў са сцэны плыве наогул нашмат менш, чым польскай мовы, але ж ініцыятыва накіраваная да палякаў, таму цяжка гэтаму здзіўляцца. На сцэне бачылі мы ўжо такія яркія беларускія зоркі, як Лявон Вольскі, Ігар Варашкевіч, Зміцер Вайцюшкевіч, а таксама такіх свежых выканаўцаў, як трансгранічны „Мёд", Яўген Валошын ці, магчыма, будучая вялікая зорка фольк-джаза Наста Някрасава. Немагчыма усіх тут пералічыць. Сярод польскіх выступоўцаў былі вакалісты такіх важных альтэрнатыўных праектаў, як „Ляо Чэ", а таксама топ-выканаўцы, напрыклад, „Раз, два, тры". Як музычны, так і грамадска-палітычны аспекты канцэрта заўсёды з'яўляюцца вельмі важнымі, доказам чаму лозунгі якія прамуюць мерапрыемства: „Пачуй Беларусь" ці „Голас Беларусі". Хаця кожны год канцэрт выклікае аптымізм і заадно крытыку, варта верыць, што такія польскія ініцыятывы будзем калісьці ўспамінаць з прыхільнай усмешкай.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 14

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 10:

Сук, хор, асада, сшытак, мара, Украіна. Смак, каша, сыр, хата, мода, ракіта.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі**, выйгралі **Марыёля Анішчук, Ася Тамашук** з Дубін, **Наталля Паскробка** з Нарвы, **Рафал Вакулюк, Анжаліка Галёнка** з Арэшкава, **Клаўдзія Дарашкевіч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Зося з першага „а” класа

— 24 —

Зося Гняздоўская ад садка вывучала беларускую мову. У II Агульнаадукацыйным ліцэі яна мела магчымасць далей працягваць адукацыю на роднай мове. Яе настаўніцай была студэнтка беларусістыкі Ганна Хіліманюк. Іх група налічвала толькі восем асоб, аднак моладзь умела супрацоўнічаць з сабой. На занятках прыдумалі многа арыгінальных ідэй, якія вучні хацелі ажыццявіць.

З нагоды Свята Волі Зося з сябрамі падрыхтавалі спектакль. Пастаноўка апавядала пра бурнае жыццё маладога Кастуся Каліноўскага. Зося дайшла да вываду, што Каліноўскі — цікавы і беларусам, і палякам. Калі яна пісала сцэнарый, часта заглядала ў драму Уладзіміра Караткевіча „Кастусь Каліноўскі”, каб адтуль зачэрпнуць натхненне. Каб ліцэісты зразумелі змест пастаноўкі, Зося падрыхтавала пераклад, які паабяцаўся прачытаць Паўлік Пятрушэня.

25 сакавіка, пасля ўрокаў, уся моладзь ліцэя і настаўнікі сустрэліся ў гімнастычнай зале, дзе чакалі ўжо навучэнцы беларускай мовы. Галоўную ролю ў спектаклі іграў Віктар Галіна з другога класа. Хлапец адчуваў сябе на сцэне вельмі ўпэўнена. Ён ужо шмат гадоў рыхтаваўся да прафесіі акцёра. Такія паводзіны не спадабаліся Тамашу Вярбіцкаму, які сеў у першым радзе і з напружанай увагай сачыў за кожным крокам акцёраў. Калі ў адной сцэне Кастусь Каліноўскі прытуліў да сябе Марыську Чарнабрыву, Тамаш амаль не ўскочыў на сцэну, каб раздзяліць герояў. Вы напэўна здагадаліся, што ролю каханай Каліноўскага іграла... Зося!

На шчасце дзяўчына не бачыла ўсхваляванага Тамаша. Дзякуючы таму яна прыгожа праспявала песню і прадэкламавала верш. Гледачы былі ўражаны тэатральнымі здольнасцямі сяброў. Некаторых з іх зацікавіла асоба Кастуся Каліноўскага. Раней амаль ніхто не ведаў, што беларусы і палякі маюць супольнага героя. Выхавацель першага „а” класа Янка Рыбачук вельмі ўзрушыўся. Пасля спектакля ён уручыў Зосі бел-чырвона-белы букет ружаў і публічна прызнаўся, што ў яго таксама беларускія карані.

Тэкст: wodrotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Радасны Дзень Волі ў Бельску

Здалёку будынак II Аульнаадукацыйнага ліцэя ў Бельску-Падляшскім выглядае нармальна, быццам у звычайны дзень. Але, калі падысці бліжэй, у дзвярах вітае нас вялікі лозунг „Жыве Беларусь!”. Вядома, сёння ж 25 сакавіка.

— Для многіх з нас, якія сёння прыйшлі ў школу, Беларусь гэта незалежная краіна, свабодная, яна жыве, — гаворыць дырэктар школы Андрэй Сцепанюк.

Святкаванні Дня Волі ў ліцэі пачаліся незвычайна: з дыктоўкі. Больш за сто чалавек прыняло ўдзел ва ўсебеларускай дыктоўцы. Як адзначае дырэктар школы, моладзь мела нагоду паказаць сваё веданне мовы, аднак у дыктоўцы больш важны яе ідэалагічны аспект.

— Важнае, каб вучні ведалі, з якой нагоды пішуць дыктоўку і што прымаюць у ёй удзел беларусы з усяго свету, — дадае Андрэй Сцепанюк.

Ад некалькіх гадоў ліцэй абраў вельмі атракцыйны спосаб святкавання Дня Волі. Няма тут ніякага пафасу, ні мартыралагічных акцэнтаў. Маладыя людзі вучацца праз гульню. Такі спосаб святкавання не толькі цікавейшы, але таксама больш паспяховы.

Першыя класы спаборнічаюць у турніры, падчас якога трэба ім праявіць веды пра гісторыю Беларусі, свята 25 Сакавіка, прадставіць гімн школы ці беларускія народныя казкі ў сваёй апрацоўцы. Турніру спадарожнічае многа смеху і добрай гульні.

— Падчас урокаў, магчыма, не ўсё застанецца вучням у галовах, — тлумачыць настаўніца беларускай мовы Яўгенія Таранта. — Думаю, што дзякуючы такой форме вучні адчуваюць святочны настрой і будуць памятаць пра свята даўжэй.

Сапраўды, святочны настрой адчуваецца ва ўсёй школе. На сценах красуюцца плакаты, зробленыя вучнямі. Іх тэматыка розная. Некаторыя прадстаўляюць Пагоню, цытаты з класікаў беларускай літаратуры. На іншых віднеюць беларускія народныя матывы. Самыя цікавыя плакаты гэта тыя, якія прадстаўляюць уяўленні аўтараў пра Беларусь. У контурах дзяржавы можна знайсці тое, з чым аўтарам асацыюецца Беларусь: гістарычныя матывы, прэзідэнт ці назвы рок-гуртоў.

Незвычайнасць дня бачна таксама сярод саміх вучняў. Некаторыя з іх апранутыя ў народныя строі, іншыя — у сцэнічныя касцюмы, у якіх будуць выступаць падчас турніру.

Дыктоўка, беларускі турнір — гэта не ўсе формы святкавання Дня Волі ў Бельскім белліцэі. Вучні другіх класаў спаборнічаюць у конкурсе на найлепшую беларускую страву. На калідоры кожны з класаў прэзентуе розныя стравы.

— У большасці рыхтавалі мы ўсё самі, у некаторых выпадках памагалі бацькі і бабулі, — тлумачыць мне адна з вучаніц.

Сталы поўныя пірагоў, варэнікаў, булак, бульбяной бабкі, варэння і іншых смакоццяў. Падрыхтаваныя другакласнікамі стравы ацэніць камісія з настаўнікаў. Мэта ясная: кожны клас хоча перамагчы. Пераможцаў не будуць адпытываць у выбраны класам дзень.

— Плакаць здарыцца яшчэ ў жыцці не адзін раз, — тлумачыць Андрэй Сцепанюк, — таму, калі маем свята, маладыя людзі павінны перайсці праз яго радасна.

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Міра ЛУКША

Эму з Эльяшук

Пасяліўся эму ў Лешуках.
Доўга добрага жытла шукаў.
Заняў клуню ў засені вязоў,
абабегшы Лешукі пару разоў.
Мае ў сваіх лапах эму моц!
Бегаў бы без перапынку дзень і ноч,
і наеўшыся капусты і гуркоў
ноч і дзень прабегаў бы ізноў.
Раптам эму, той заморскі птах,
што яму так даспадобы ў Лешуках,
стаў, разявіў дзюбу, прачытаў,
бы каменьчыкі малыя паглытаў:
„Eliaszuki” (ён такое бачыў як заўжды),
нізам: „Лешукі”. „Як трапіў я сюды?!”
Як не дзіўна, што эму можа ў Лешуках
бегаць па дварах, гародах і садах,
так і найсапраўднай назве Лешукоў,
што гучала тут спакон вякоў
пара вярнуцца на ўказальнікі ізноў.
Жывуць хай Лешукі, а эму
— будзь здароў!

Міхал МІНЦЭВІЧ

У царскай Орлі

У 1795 годзе адбыўся трэці падзел Польшчы і канец яе незалежнасці. 25 лістапада падаўся ў адстаўку кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. У наступным годзе Орля апынулася ў складзе Прусіі. Годам пазней была завершана адбудова згарэўшай сем гадоў раней арлянскай царквы; будаўнічы матэрыял — млын з Трывежы — дала графіня Браніцкая. У 1799 годзе пачалася будова званіцы побач царквы. Орля пераходзіць у валоданне князя Вітгенштэйна, лютэранскага верніка, які ажаніўся з княгіняй Радзівілаўнай. У 1807 годзе Прусія здае Орлю Расіі. У той час мястэчка налічвала 1586 жыхароў, у іх ліку 1102 яўрэі. У 1839 годзе большасць арлянскіх уніятаў пераходзіць у праваслаўе.

Хаця студзеньскае паўстанне 1863-1864 гадоў закончылася няўдачай, аднак пасля 1864 года наступілі карэнныя змены, былі праведзены рэформы распрыгонення. У Беластоцкай акрузе прыгон быў адменены ў 1861 годзе, а паншчына — у 1863 годзе. Сяляне атрымалі зямлю пад выкуп паводле расійскіх норм; заплаціць за яе трэба было на працягу 49 гадоў, а канкрэтна да 1 лістапада 1919 года (да часу заплаты зямля была законнай уласнасцю грамады). У Орлі каля сямідзесяці яе жыхароў купілі агулам 372 дзесяціны (адна дзесяціна займала плошчу 2 400 квадратных сажняў або — паводле цяперашніх мерак — 1,09 гектара) і 1 629 квадратных сажняў (адзін сажань быў мерай даўжыні роўнай 2,13 метра, або тром аршынам — па 71 см; квадратны сажань быў роўны каля чатыром з паловай квадратным метрам) ворнай зямлі і сенажацей (па сённяшніх мерках гэта складала пад 420 гектараў) ды восем дзесяцін пляцоў і агародаў (амаль дзевяць гектараў).

У канцы 1900 года ў Орлі пражывала аж 4 286 жыхароў, з якіх больш за 80% былі яўрэямі — 3 678 чалавек. Дрэнныя бытавыя ўмовы ды перанасяленне, а найперш неахайныя адносіны да санітарных і гігіенічных патрабаванняў паспрыялі ўзнікненню эпідэміі халеры і тыфу. Паўстагоддзя раней у выніку эпідэміі халеры знікла з зямлі Вэрвечка — вялікая вёска (82 гаспадаркі) побач Орлі. Амаль усе жыхары гэтай вёскі памерлі, сёння пра іх не згадваецца, не захавалася выдзеленае месца іх пахавання. І хаця яно аддалена ад прыхадскіх могілак на нейкіх сто метраў, ніхто яго не наведвае, ніхто не моліцца за спачылых там.

Толькі найстарэйшыя мае суразмоўцы вярталіся ўспамінамі да даўнейшай мінуўшчыны. У сваім архіве я захаваў шмат іхніх выказванняў, многія з якіх яшчэ не былі абнародаваны, многія сумныя і трагічныя...

Паміралі ад халеры

Наташа Камарчук, 1905 года нараджэння, гаварыла:

— У Орлі яшчэ да першай сусветнай вайны ўспыхнула эпідэмія халеры. Душыла жыдоў, а нашых, хрысціян — не! Але ў жыдоў было так: у панадворку тры-чатыры хаты стаялі, былі там звалкі ўсялякіх адкідаў, быў смурод, і з таго ў іх халера завялася. А ад жыдоў у прынцыпе смярдзела, як выходзілі на шпацыр, то чуць гэта было.

Фота Міхала Мінцэвіча

Наташа Камарчук. 1996 г.

Помню анекдатычную падзею ў Орлі. Жыды не бачылі канца той эпідэміі, а нашы, праваслаўныя, не хварэлі. Нашых толькі сто хат было, а апошнія былі жыдоўскія. Жыды рашылі тады прымяніць забабонны фокус. Нанялі яны нашага хлопца, далі яму добрыя грошы і ён згадзіўся адыграць даручаную яму ролю. Меў ён стаць перад жыдоўскімі могілкамі ў той час, калі туды будуць весці пакойніка. Мелі яго спытаць, ці там ёсць месца для пахавання, а ён меў адказаць, каб неслі памерлага на нашы, хрысціянскія, могілкі. Мела гэта быць заклінаннем, ад якога хвароба мела перайсці на хрысціян. Ну, і той хлопец стаіць перад могілкамі і чакае. А калі жыды падышлі са сваім пакойнікам і спыталі „Ці тут ёсць месца для пахавання?", ён у адказ спытаў „Оно одін? Фурамі вэзіетэ!" (Толькі адзін? Вязіце фурманкамі!). Як жа яны кінуліся за тым хлопцам, то ён уцякаў аж да Крывятыцкага лесу, бо калі б не ўцёк, то яго забілі б.

Яўрэі вельмі плакалі ў час пахавання, а калі ў пакойніка не было сям'і, то наймалі плачку з жыдоў, бо ніхто іншы не пайшоў бы, каб не заразіцца. Помню такое адно здарэнне... Мая мама паходзіла з Дубін. І адзін дубінец узяў сабе жонку з Орлі, сястру Міхала Мартыновіча. Яна пастаянна наведвала родную Орлю. Аднойчы ехала яна з мужам фурманкай у Орлю да свайго брата Міхала. Даехалі яны да Орлі, а тут на „кворасе" (яўрэйскіх могілках з боку Шчытоў) акурат жыда хавалі. Пакойніка неслі на высокіх насілках, а ад яго і смурод нёсся. І той муж раптоўна, на дарозе, захварэў; пахавалі яго ў полі з боку Антанова, на месцы халерычных могілак вёскі Вэрвэчкі.

Арлянскія католікі

— Пры цары я адзін год правучылася ў Орлі па-руску, — успаміналa далей Наташа Камарчук, — а пасля, як прыехалі з Расіі, то ўжо ў Орлі палякі паявіліся; адкуль яны тут узяліся, як іх тут не было? У нас адзін паляк жыў, Назарэвіч, а пасля нарабілася палякаў, і нашы парабіліся палякамі. Пры цары палякі не мелі права нават у свята стаўляць у акне „алтарык"...

Варта тут прысвяціць час даўнім арлянскім католікам, бо іх мінулае вартае ўвагі. Сужыццё католікаў з праваслаўнымі (раней уніятамі) было настолькі добрае, што раздзялялі яны ўсялякі лёс суседзяў. Пры цары католікі служылі ў царскай арміі, выязджалі ў Расію, а некаторыя нават там аставаліся на пастаяннае жыхарства, звязваючыся з рускімі шлюбамі.

Рознымі дарогамі прыходзілі арляне, у тым ліку і католікі, да змены свайго веравызнання. Вось што не так даўно ўспамінаў пра сваіх продкаў Уладзімір Здановіч з Орлі, 1921 года нараджэння.

— Мой дзед Фердынанд Фёдаравіч Здановіч выводзіўся з Тыкаціна і быў католікам. Калі пры цары жыў ужо ў Орлі, у палове свайго дома (сёння там пляц Кацэйкі) меў касцёлак. Не было ў той час польскай школы, дзедка меў сярэднюю адукацыю і вечарамі патайком навучаў. Канспірацыя была раскрыта, арыштавалі яго і завезлі на пастарунак у Дубіны; і былі б вывезлі ў Сібір. Выратавала яго тое, што быў выдатным майстрам, патрэбным бацюшкам — і яны паручыліся за яго. Аднак дзед мусіў падпісаць абавязацельства, што пераходзіць у праваслаўе. І ўжо з майго бацькі наш род стаў праваслаўным.

Марыя Назарэвіч з сынамі

Некалькі слоў пра род Назарэвічаў. У Орлі ў царскі перыяд было некалькі сем'яў — уніятаў (пасля праваслаўных) і католікаў — з такім прозвішчам, у тым ліку і мой прадзед па мацярынскай лініі. Аднак некаторыя мяркуюць, што католікі Назарэвічы ўзяліся з таго, што пасля адмены ўніі не ўсе з гэтага роду вярнуліся ў праваслаўе. Гэта магчыма, хаця ніхто тут дакладна не аналізаваў сваіх родавых каранёў. Гэтыя падзеі адбываліся даўным-даўно і былі вынікам палітычнага ціску, калі людзей адміністрацыйна прымушалі мяняць веравызнанне (так у час завязвання ўніі, як і ў час яе ліквідацыі). Аднак жыццё паказвае, што праваслаўе здавала свае пазіцыі, калі, напрыклад, нейкі праваслаўны жаніўся з каталічкай і пакідаў Орлю; гэтак сталася з братам майго дзеда Андрем.

Як я ўжо раней адзначыў, нешматлікія арлянскія католікі падаваліся ў бежанства, хаця Касцёл не агітаваў да выезду. На гэтую тэму прывяду некалькі прыкладаў і цікавых фактаў. Збіраючы матэрыялы для аўтарскага альбома „Орля і яе жыхары ў старой фатаграфіі да 1945 года", я сутыкнуўся з многімі архіўнымі здымкамі з царскага і бежанскага перыядаў. Вось каталічка Марыя Назарэвіч, народжаная ў Орлі, выехала з сямейнікамі ў бежанства, у Сібір. Там яна выйшла замуж і асталася. Захавалася яе фатаграфія з двума сынамі; адзін з іх называўся Юзаф. Абодва сыны загінулі ў час другой сусветнай вайны. На аснове захаваных здымкаў вядома таксама, што ў бежанстве была і сястра Марыі Ядвіга з дачкой Браніславай і мужам Віктарам Аленскім.

Іншай каталіцкай сям'ёй у Орлі былі Цвяцінскія. Яе арлянскую гісторыю запачаткаваў Аляксандр Цвяцінскі, — расказала мне ягоная ўнучка Барбара, — калі атрымаў на гэта згоду царскіх улад. Быў ён жанаты са Стэфаніяй з роду Намяткевіч. У час бежанства яны таксама выехалі ў Расію і там, у Маскве, Аляксандр служыў у царскай арміі. Да сёння захаваліся іх здымкі, у тым ліку вайсковыя.

Варта адзначыць, што гэтая сям'я ў міжваенны перыяд вылучалася ў здамінаванай жыдамі Орлі. Цвяцінскі адзіны з усіх арлянскіх хрысціян меў у панадворку сваю невялікую мясарню ды нейкую гасподу, у якую заглядалі і яўрэі, але галоўным чынам пакідалі тут свае заробкі работнікі мясцовай кафлярні.

Калі гаварыць пра сённяшніх малалікіх арлянскіх католікаў, то варта падкрэсліць з'яву, якая наўрад ці выступае ў іншых мясцовасцях. Менавіта значная частка арлянскіх католікаў карыстаецца мясцовай беларускай гаворкай. Гэта здзіўляе яшчэ больш, бо маладыя праваслаўныя гавораць паміж сабой ужо толькі па-польску. Многія арлянскія католікі прымаюць з каляднымі візітамі праваслаўных святароў і здараецца, што каталіцкага пакойніка хавае бацюшка.

І яшчэ адна заўвага: тут склаўся стэрэатып, што калі хто католік — той і паляк. Вось пасля другой сусветнай вайны ў Орлі і наваколлі пасялілася некалькі каталіцкіх сем'яў, якія штодзень карысталіся чыстай беларускай літаратурнай мовай. Гэта асабліва цяжка зразумець — як я сам заўважыў — людзям з польскай глыбінкі.

(працяг будзе)

Салідарнасць у час крызісу

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

„So-li-darni z Bia-ło-rusią! So-li-darni z Bia-ło-rusią!" — гэта можа не рыфмуецца, але вось гэтая фраза ўжо чатыры гады асацыюецца з канцэртамі „Салідарныя з Беларуссю" ў польскай сталіцы.

Калі ў 2006 годзе ў Беларусі адбываліся прэзідэнцкія выбары, па ўсёй Польшчы ладзіліся акцыі салідарнасці з беларускім народам, а прынамсі з гэтай часткай, якая хацела змен. Спосабаў адзначэння гэтай падзеі было мноства: палітыкі махалі беларускімі сцягамі, музыкі бунтарна іграліі быццам у 80-х гадах, а ініцыятыва „Вольная Беларусь" хуценька сарганізавала вялікі канцэрт на рынку Новага места ў Варшаве. Канцэрт зразу выклікаў вялікую дыскусію. Ці наладзілі яго, як трэба, ці музыкі атрымалі заплату, а дзе ў гэтым усім беларуская меншасць, а хто зарабіў, а хто здзівіўся і чаму. Частка пытанняў была зусім без сэнсу, частка аднак добра абгрунтаваная. Безумоўна, аднак, канцэрт атрымаўся паспяховы, бо і польскае тэлебачанне яго трансляваў ды людзі пачулі, што ёсць Беларусь, якая патрабуе дапамогі. Ці патрабуе і якой дапамогі? — гэта таксама тэма для дыскусіі, бо галасоў столькі, што і людзей. Сёлета нават беларускія музыкі перад чацвёртым выпускам канцэрта „Салідарныя з Беларуссю" казалі мне, што ў Беларусі не так дрэнна. Затое для іх варта прыехаць у Варшаву, паказацца і набраць новага сцэнічнага вопыту.

— Выступаем тут з класнымі музыкамі, для прыкладу з „Раз, два, тры", — кажа Яўген Валошын. — І так я меў быць у Варшаве, дык чаму мне не выступіць.

— Я даведаўся пра свой выступ тры дні таму, — кажа Саша з „IQ48", — але абмеркавалі справу і хлопцы пагадзіліся, каб я сюды сам прыехаў.

Канцэрт, на маю думку, зараз ужо мае больш прамацыйны характар. Не адчуваецца такога эмацыянальнага зрыву. Напрыклад, шмат людзей зацікавіла акцыя прыхільнікаў Лукашэнкі як лепшага гаспадара ў параўнанні з польскімі ўладамі, якія стаялі на другім баку вуліцы, чым Тэатральны пляц, дзе сёлета праходзіў канцэрт.

— Канцэрт выглядае сціплей, бо ў нас нашмат менш грошай, перш за ўсё таму, што няма трансляцыі па тэлебачанні, — кажуць арганізатары. — Мы робім гэта без ганарараў, але і музыкі выступаюць без ганарараў. Найважнейшая — ідэя.

Але і гэтая ідэя слаба адчувалася. Проста канцэрт меў для беларускіх выканаўцаў больш прамацыйны характар.

— Гэта перш за ўсё каб паказацца, — кажа пра сэнс выступу менеджэр некалькіх выступоўцаў сёлетняга канцэрта Ігар Знык.

Дарэчы, няма ў гэтым нічога дзіўнага. Нават цешуся, што беларускія выканаўцы прэзентуюцца ў Польшчы на вялікіх сцэнах, што стараюцца прабівацца на Захад са сваёй музыкай і добра, што ёсць месцы, дзе іх хочуць слухаць і адкрыта прымаюць. Але колькі ў гэтым засталося ідэі і на колькі салідарнасць патрэбная ў такім выглядзе — не ведаю.

— Збіраем грошы на летнюю школу ў Беларусі, — кажуць валанцёры, — каб дапамагчы ў дэмакратызацыі грамадскага жыцця.

Калі ёсць дазвол на публічнае збіранне грошай, дык можна і такім чынам памагаць. Магчымасці здаюцца быць неабмежаванымі. Здзівіла мяне, аднак, што так лёгка ў Беларусі ладзяцца летнія школы, але валанцёры былі яшчэ больш здзіўленыя маім пытаннем. Ёсць і іншая мэта канцэрта, пра што больш ахвотна распавядаюць арганізатары. Менавіта свядомасць польскага грамадства. Звычайнае апытанне на вуліцах Варшавы паказала, што яна вельмі нізкая, але гэтага можна было спадзявацца. Нас наогул цікавіць сваё наваколле або свет паказваны ў медыях. Калі Беларусь і акцыі салідарнасці не паяўляюцца ў тэлебачанні, то ведае пра іх не столькі людзей, колькі, думаю, спадзяюцца арганізатары.

Меншы маштаб, менш вядомыя беларускія выканаўцы, нейкае пачуццё недахопу — гэта вынік крызісу, які, паводле арганізатараў, дабраўся і да канцэрта. Мне здаецца, аднак, што кшталт гэтага мерапрыемства адпавядае зараз і сітуацыі Беларусі. У медыях еўрасаюзныя палітыкі перадумваюць магчымасці перамоў з Лукашэнкам — значыць, хіба будзе лепш. У Беларусі забароненых гуртоў няма — значыць, здаецца, палепшылася. Дык навошта такі канцэрт? А навошта „Басовішча"? Па гэтай самай прычыне. Ёсць людзі, якія патрабуюць гэта рабіць і людзі, якія патрабуюць бываць у такіх месцах. А пашыранне ведаў і свядомасці пра беларусаў і Беларусь заўсёды неабходнае і можа быць апраўданнем для кожнай такой ініцыятывы, бо пра беларусаў палякі надалей не ведаюць амаль нічога.

Дзень Волі ў Таліне

Раніцай 25 сакавіка, у дзень абвяшчэння незалежнасці БНР, у старым горадзе Таліна прайшло ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі на будынку па вуліцы Вене 19, дзе з 1920 па 1925 год знаходзілася Ваенна-Дыпламатычная місія БНР у Эстоніі пад кіраўніцтвам генерал-лейтэнанта Алега Карчак-Крыніцы-Васількоўскага.

Ініцыятыва па стварэнню дошкі належала актывістам беларускай сеткі Кангрэса новай беларускай дыяспары Еўропы і ЗША. Ахвяраванні на дошку збіралі пераважна маладыя людзі з дыяспары і з Беларусі. Таксама справу актыўна падтрымалі беларускія супольнасці Вялікабрытаніі, Эстоніі, ЗША і іншых краін. Дошку стварыў вядомы беларускі скульптар Алесь Шатэрнік.

На адкрыццё былі запрошаны прадстаўнікі беларускай дыяспары, эстонскія грамадзянскія актывісты, палітыкі. З вітальным словам звярнуліся сябры Рады БНР Юры Юркевіч і Павел Марозаў.

„Карчак-Крыніца-Васількоўскі як раз той прыклад, які руйнуе ідэялагему савецкага часу аб тым, што беларусы гэта сяляне, людзі без адукацыі, наогул без нічога. Гэта быў генерал пры двары апошняга расійскага імператара, самы малады генерал царскага войска. Падчас службы ў якасці амбасадара БНР у Эстоніі меў добрыя адносіны з маршалам Фінляндыі Манэргеймам і галоўнакамандуючым эстонскага войска Лайданерам. Таксама ён быў

багатым чалавекам, але пры гэтым мецэнатам і філантропам, пры яго падтрымцы ў Таліне былі пабудаваны дзве царквы. У Таліне ён пражыў да 1940 года, пакуль савецкая ўлада, акупаваўшы Эстонію, яго не расстраляла. Для нас з'яўляецца вялікім гонарам, што ў беларусаў быў такі амбасадар БНР у Эстоніі", — адзначыў Павел Марозаў, дырэктар арганізацыі Новы шлях для Беларусі (Valgevene Uus Tee), сябра Рады БНР

Намеснік старшыні Задзіночання беларусаў Вялікабрытаніі, чалец Рады БНР Мікола Пачкаеў, які прыбыў на адкрыццё памятнай дошкі з Лондана, зачытаў віншаванне старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы з нагоды адкрыцця памятнай дошкі ў Таліне і Дня незалежнасці БНР. Яму ж было прадстаўлена права адкрыць памятную дошку.

„Сёння была ўшанавана яшчэ адна старонка гісторыі беларуска-эстонскіх адносін. З моманту свайго нараджэння Эстонская Рэспубліка і БНР заўсёды дапамагалі і падтрымлівалі адна адну. За незалежнасць Эстоніі са зброяй ваяваў Асобны атрад БНР пад камандаваннем генерала Станіслава Булак-Балаховіча, а Эстонія адной з першых прызнала незалежнасць БНР", — адзначыў Ігар Случак, прадстаўнік беларуска-эстонскай арганізацыі Новы шлях для Беларусі.

Пасля гэтага ў эстонскім парламенце адбыўся прыём у віцэ-спікера Крысціны Оюланд з нагоды Дня незалежнасці БНР, на якім спадарыня Оюланд павіншавала беларусаў з гэтай знамянальнай датай. Пасля прыёму ў віцэ-спікера ў адной з залаў парламента адбыўся круглы стол паміж дэпутатамі эстонскага парламента і беларусамі на тэму беларуска-эстонскіх адносін, прысвечаны ўгодкам незалежнасці БНР.

Ініцыятарам і арганізатарам урачыстых мерапрыемстваў была беларуска-эстонская арганізацыя Новы шлях для Беларусі (Valgevene Uus Tee). Мерапрыемства адбылося пры падтрымцы Рады БНР. Стварэнне дошкі падтрымалі наступныя арганізацыі і ініцыятывы: супольнасць „Трэці Шлях", Задзіночанне беларусаў Вялікабрытаніі, Беларускі моладзевы рух Амэрыкі, а таксама Беларускія ініцыятывы Эстоніі.

www.belmov.org

Уладзімір ДАНІЛЮК

Успаміны

Ляжу і думаю, замкнуўшы вочы,
Як я калісь хадзіў па ночы,
І як з вячорак ішоў дадому,
Дык страшна ісці было адному.
А з Зубава ў нашы парогі
То кіламетр цэлы дарогі.
У тых часах была няўбіта
І зверху жвірам не пакрыта.
Найгорш і прыкра тут ішлося
У мокру ды халодну восень,
І часам дождж крапіў у вочы.
Найгорш было ў такія ночы.
Добра было ісці зімою,
Як свяціў месяц нада мною
І ззялі зоры ўкруг яго,
То і нястрашна тут было.
На небе месяц круглы, цэлы,
А на зямлі снег усюды белы,
А дзесь на хутарах у далі
Сабакі голасна брахалі.
А як у свята, пры нядзелі,
То спевы ў даль плылі, ляцелі,
І я іх чуў многа разоў,
Як неслісь з Зубава і Кнаразоў.
Калісь быў дух такі ў народзе,
З ім песня заўша жыла ў згодзе,
Як бы трымалася пад рукі.
У хатах спявалі, і на бруку.
У адзін вечар выйшаў я з хаты
Вады з калодзежа набраці.
Месяц ужо высока быў,
Над Княжаю гарою плыў.
Трашчалі вольхі на марозе,
Што раслі збоку пры дарозе,
Пад снегам зайцы ўсе сядзелі,
Што як штоночы лубін елі.
І ў той хвіліне мне здалося,
Як бы кругом усё затраслося.
То з Зубава нёсся па полі
Знаёмы голас Сцёпы і Колі.
Хлопцы ішлі, сялом шагалі
І на два галасы спявалі,
А спеў іх гучны і харошы
Плыў тою ноччу над парошай.
У зімовы вечар і вясною
Стыкаўся з песняй не адною,
Ды таго спеву Сцёпы і Колі
Я не забыў дасюль ніколі.

Сход „Гаю”

Большасці людзей нядзеля асацыюецца з адпачынкам, агляданнем тэлебачання. Аднак не ўсе думаюць у такі спосаб. Нядзеля можа быць добрым днём для сходу ці сустрэчы сяброў няўрадавай арганізацыі. Ведаюць пра гэтае члены Таварыства „Гай”.

22 сакавіка ў будынку былога вясковага дома культуры ў Райску прайшоў IX справаздачна-выбарны сход Таварыства.

— Найбольш істотнай справай у 2008 годзе, над якой засяроджвалі мы свае сілы, было змаганне за прызнанне ахоўванымі прыродазнаўчых, культурніцкіх і ландшафтных вартасцей на абшары вёскі Гацькі, — тлумачыў падчас справаздачнай часткі старшыня „Гаю” Ян Мордань.

Але гэта не адзінае, чым займалася Таварыства „Гай” у 2008 годзе. Адной з мэт, якія паставілі сабе яго стваральнікі, была дапамога мясцовым земляробам. За мінулыя 12 месяцаў члены „Гаю” працягвалі супрацоўніцтва з жыхарамі Гацькоў у справе падзелу зямлі, якая засталася ад дзяржаўнай аграрнай гаспадаркі.

Апрача гэтага члены арганізацыі ўдзельнічалі ў многіх канферэнцыях, курсах і сустрэчах ва ўсёй Польшчы.

— У 2008 годзе пасля многіх расчараванняў прадстаўнікі таварыства „Гай” адмовіліся ад супрацоўніцтва з Лакальнай групай дзеяння „Белавежская пушча”, — сказаў пра менш прыемныя бакі працы Ян Мордань. — Паводле членаў нашай арганізацыі дзейнасьць ЛГД зусім адарваная ад сапраўдных патрэб жыхароў вёскі Гацькі.

Фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Да таварыства „Гай” належаць жыхары вёсак Гацькі, Райск ды Храбалы. Апрача гэтага ў аб’яднанні дзейнічаюць жыхары Бельска-Падляшскага і Беластока.

— Да таварыства „Гай” належу ўжо некалькі гадоў, — тлумачыць солтыс вёскі Райск Ірэна Цішук. — Дзейнасць у Таварыстве дае мне многа асабістага задавальнення. Нас усіх цешыць, што эфекты нашай працы відаць у Райску, Храбалах ці Гацьках. Хацелася б рэалізавць больш праектаў, каб штось пакінуць для гэтага грамадства.

Госцем сходу была войт Бельскай гміны Раіса Раецкая. Станоўча ацаніла яна супрацоўніцтва гмінных улад з няўрадавымі арганізацыямі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі гміны. Падкрэсліла таксама, што ёсць арганізацыі, якія не зарэгістраваныя у самой гміне, але свае дзеянні кіруюць да яе жыхароў. Прыкладам гэтага можа быць Аб’яднанне Музей малой айчыны ў Студзіводах.

— Дапамога з боку Гміннай управы заключаецца на фінансавай і пазафінансавай падтрымцы. Супольна з арганізацыямі ствараем і рэалізуем розныя праекты. У агульным плане найчасцей гэта пазафінансавае супрацоўніцтва, — дадала Раіса Раецкая.

Пасля дыскусіі прысутныя на сходзе члены Таварыства выбралі новыя ўлады. Старшынёю на чарговы тэрмін быў выбраны Ян Мордань. Апрача яго галоўнае праўленне складаюць Галіна Данілюк (скарбнік), Іаланта Мордань (сакратар), Мікалай Федарук ды Аляксандр Семянюк.

— Хаця ў сённяшнім сходзе прыняла ўдзел невялікая колькасць членаў нашага аб’яднання, многія з гэтых, якія не змаглі прыехаць, заўсёды дапамагаюць у дзеяннях і штодзень можна разлічваць на іх, — падвёў справаздачна-выбарны сход Ян Мордань.

Калі гаварыць пра планы на гэты год, Таварыства „Гай” будзе надалей змагацца за захаванне прыродазнаўчага і культурніцкага краявіду вакол Гацькоў.

— Гэтая спадчына гіне на нашых вачах, — сцвердзіў Ян Мордань. — Хочам, каб нашае месца тут, дзе мы жывём, засталося прыгожым і некранутым.

Міхась СЦЕПАНЮК

Калі рухацца на ўсход ад Мінска, то на адлегласці ў 35 кіламетраў перад вачыма вандроўніка паўстане невялікі гарадок з ласкаючай слых шапатлівай назвай — Смалявічы. Акцэнт тут трэба рабіць на перадапошні склад, што і надае гэтаму слову нейкае пяшчотнае адценне.

Смалявічы даволі шырока прысутнічаюць у віртуальнай прасторы. Праўда, па-беларуску аб іх распавядае толькі адзін сайт — http://smaliavichy.org. Аднак і ў ім прысутнічае беларуска-руская мяшанка, што аддае нейкай несур’ёзнасцю. Разам з тым, нічога страшнага для Беларусі тут няма — аналагічным чынам даносяць інфармацыю да сваіх чытачоў многія інтэрнэтныя і друкаваныя СМІ.

Смалявіцкі сайт выглядае даволі неардынарна ў параўнанні з іншымі падобнымі інтэрнэт-рэсурсамі. З першага погляду падаецца, што ты трапіў на нейкую старонку, што прэзентуе тэхнічныя прылады альбо з’яўляецца месцам, дзе адсочваюцца таргі акцыямі, бо надта многа дробных дэталяў. З таго хочацца параіць распрацоўшчыкам партала зрабіць яго больш прывабным для вока, не імкнуцца распавесці адразу аб усім на галоўнай старонцы. Дзеля справядлівасці, аднак, варта адзначыць, што сайт абнаўляецца аператыўна, аб чым сведчаць даты навінных паведамленняў, якія месцяцца пад выйсцямі да розных рубрык.

Пэўна, для кожнага мястэчка навіны найбольш цікавыя тыя, што распавядаюць аб надзённых патрэбах іх жыхароў. Што ж тычыцца віртуальных гасцей, то, мяркуецца, ім найбольш будзе карысна для ўласнай эрудыцыі зазірнуць на „гістарычную” старонку. Менавіта на ёй можна даведацца, якую ролю адыграла тое ці іншае паселішча ў мінулым беларускага народа і якое значэнне яно мае цяпер. На смалявіцкім сайце пра гэта добра распавядаецца на старонцы „Смалявічы”, дзе паведамляецца не толькі аб гісторыі, але і аб сімвалах данага мястэчка. Праўда, без хібаў і тут не абышлося — гісторыя, аб якой хочуць распавесці нам аўтары партала, тычыцца выключна Студзеньскага паўстання 1863 г., дакладней таго, якім чынам яно закранула Смалявічы. Было б нядрэнна, каб натхняльнікі сайта, а гэта, мяркуючы па інфармацыі ў рубрыцы „Пра нас”, грамадская ініцыятыва „За новыя Смалявічы”, больш дбайна падышлі да гэтага чынніка, бо менавіта па гістарычных звестках аб паселішчы робяць людзі высновы аб нейкай яго аўтарытэтнасці. Тым больш, што тыя, хто „за новыя Смалявічы” гэта людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, аб чым сведчыць не толькі склад арганізацыі, але і яе дзейнасць — „сваімі прыярытэтамі сябры Ініцыятывы вызначылі асветніцкую і адукацыйную дзейнасць. У сувязі з чым вядзецца праца па стварэнню інтэрнэт-партала. Невялікім накладам выпускаецца бюлетэнь «Горад Наш»”, — распавядецца на сайце.

Што ж тычыцца іншых рубрык віртуальных Смалявічаў, то найбольшае зацікаўленне можа выклікаць „Фотагалерэя”. Зацікаўленне было б яшчэ большым, калі б аўтары сайта паклапаціліся падпісаць кожны фотаздымак, прынамсі ў падборцы „Помнікі на тэрыторыі Смалявіцкага раёна”.

Калі віртуальны госць Смалявічаў вырашыць наведаць гэтае мястэчка ў рэальнасці, то, магчыма, яму будзе карыснай рубрыка „Інфармацыя”, дзе месцяцца карты горада і раёна, а таксама расклад руху цягнікоў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Звычайны сакавік

Падсумоўваючы першы веснавы месяц, можна канстатаваць канцоўку ў некаторых зімовых відах сезона. Біятлонныя і фрыстайлавыя, чыста лыжныя дысцыпліны, прынеслі больш расчаравання, чым радасці, фігурнае коўзанне і канькабежны спорт увогуле ў Беларусі ў глыбокім заняпадзе, а хакейныя вынікі падводзіць яшчэ рана. Большага чакалася і ад чэмпіянату свету па велатрэку. А ў цэлым месяц выдаўся халодным па надвор’і, але звычайным у спартовым плане. Прадстаўляем традыцыйныя пяцёркі лепшых.

1. Вікторыя Азаранка (вялікі тэніс) упэўнена ідзе да сусветных вяршыняў. На буйным турніры ў амерыканскім Індыян-Уэлсе яна выйшла ў паўфінал у адзіночным разрадзе, а разам з расейкай Верай Званаровай перамагла ў спаборы дуэтаў. Удала выступае і на турніры ў Маямі ў гэтыя дні. Як вынік поспехаў у бягучым сезоне — уваход у дзесятку мацнейшых тэнісістак планеты.

2. Надзея Астапчук (штурханне ядра) на зімовым Кубку Еўропы па кіданнях перамагла з вынікам 18,8 м, не пакінуўшы канкурэнткам аніякіх шанцаў.

3. Меліта Станюта (мастацкая гімнастыка) заваявала тры бронзавыя ўзнагароды на этапе турніру Гран-пры, які прайшоў у Чэхіі, у сталіцы Маравіі горадзе Брно. Наша гімнастка (дарэчы, праўнучка славутай акторкі Стэфаніі Станюты) стала трэцяй у практыкаваннях з мячом, стужкай і скакалкай. А ў цэлым упэўнена ўваходзіць у эліту.

4. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) на адкрытым першынстве Нямеччыны стала сярэбранай лаўрэаткай.

5. Вольга Панарына (велатрэк) на чэмпіянаце свету, што прайшоў у польскім горадзе Прушкаў, была вельмі блізкай да прызавога месца, але ў заездзе за 3-е месца, на жаль, саступіла.

1. Максім Мірны (тэніс) у пары з ізраільцянінам Эндзі Рамам на прадстаўнічым турніры ў Індыян-Уэлсе гуляў як у свае лепшыя часы. У паўфінале яны выбілі з розыгрышу мацнейшы дуэт свету братоў Браянаў. Праўда, паставіць тлустую кропку не ўдалося, але і другое месца — вельмі важкі вынік.

2. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) як звычайна высока трымае статус аднаго з мацнейшых сталовых тэнісістаў старога свету. У мінулым месяцы да сваіх тытулаў ён дадаў сярэбраны медаль на адкрытым чэмпіянаце Нямеччыны.

3. Міхаіл Грабоўскі (хакей) пасля працяглага застою разгуляўся ў мацнейшай лізе свету не на жарты. Як вынік — зайздросная бамбардырская серыя за свой клуб „Таронта” і прызнанне некалькі разоў у ліку першых зорак матча.

4. Васіль Кірыенка (велатрэк), які летась стаў чэмпіёнам планеты, на гэты раз на першынстве свету задаволіўся 5-й пазіцыяй, але пацвердзіў свой клас.

5. Аляксандр Усцінаў (бокс) спакваля заваёўвае сабе імя на важнейшых рынгах свету. У нямецкім Штутгарце ён дамогся чарговай вікторыі ў паядынку ў суперцяжкай вагавай катэгорыі з амерыканцам Байранам Полі. Усцінаў адправіў саперніка ў накаўт ужо ў другім раўндзе.

Сярод камандавых калектываў найперш варта вылучыць зборную па міні-футболе, якая ўпершыню ў гісторыі адолела кваліфікацыйны бар’ер і выйшла ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы. Сярод жанчын адзначым эстафетную каманду (4 па 400 мэтраў) па лёгкай атлетыцы, якая заваявала бронзавыя ўзнагароды кантынентальнага першынства ў залах. У складзе квартэта выступілі Алена Кіевіч, Кацярына Бобрык, Ганна Ташпулатава і Кацярына Мішына.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Яшчэ адна харыстка

Калі я адведала спадарыню Анну Ясюк, яна якраз сядзела за сталом у цёплай хаце і чытала псалтыр. Хата вялікая, а спадарыня Анна жыве адна, як многія жанчыны ў Трасцянцы. Муж памёр у 2000 годзе. Мікалай быў узяты на фронт у 1944 годзе і ваяваў над Нысай, дзесьці там, дзе загінуў генерал Аляксандр Вашкевіч з Белавежы. Гандзя тады гадавала сына Ваню адна і нарадзіла другога сына Мішу. Муж Мікола вярнуўся з вайны і ў іх нарадзілася яшчэ двое дзетак — Віця ў 1949 г. і дачушка Маня ў 1960 годзе.

Дзве харысткі — Анна Ясюк (злева) і Анна Стахіюк

І ўжо спакойна займаліся сваёй гаспадаркай, выхоўвалі сваю грамадку, вучылі яе. Хлопцы паканчалі школы, засталіся жыць у горадзе, пажаніліся. Потым вылецела ў свет і наймалодшая — Маруся. А бацькі працай сваёй як маглі — дапамагалі дзецям. Трэба адзначыць, што муж пані Анны вельмі добра ўмеў выпраўляць усялякія шкуры: і на кажухі, і на каўняры. Прыбытак быў да гаспадаркі неблагі.

У святы і кожную нядзелю спадарыня Анна хадзіла ў царкву, бо спявала ў царкоўным хоры з Аннай Стахіюк і Нюшай Максімчук ад дзіцячых гадоў. А цяпер бядуе, што ў сваю царкву не зойдзе, бо ўжо сілы не тыя. У маі міне ж ёй ужо 85 гадоў! А ў царкву з тае трасцянскае „Даліны" ажно кіламетр! І перажывае жанчына прывыклая спяваць...

Адно добра, што наведваюць Маму і Бабулю дзеці, унукі і праўнукі. Унукаў дачакалася васьмёра. Сярод іх — пяць дзяўчатак. А праўнукаў аж 13 і толькі 2 дзяўчынкі. Так што род Ясюкоў з Трасцянкі не прападзе! Цешыцца Гандзя з таго, што побач паставіў хату найстарэйшы сын Ваня і з таго, што найбольш клапоціцца пра маму дачка Маня. І я паціху зайздрошчу Анне, бо мне Бог не даў дачкі!

Рута

На кім трымаецца хата

Калісь у адной з газет прачытаў я, што мужчына трымае тры вуглы хаты, а жанчына толькі адзін. Аргументацыя гэтага выказвання была такая, што калі муж памрэ, то ўдава не спраўляецца тады з гаспадаркай і пачынае паступова распрадаваць супольна нажытую маёмасць.

У мяне на гэты конт зусім іншае меркаванне, аснованае на фактах. Памойму гэта жонка трымае тры вуглы хаты, а муж толькі адзін. Бо нават калі муж памрэ — а сёння так найчасцей бывае — то ўдава, калі не ў сілах справіцца ёй з гаспадаркай, прадае паступова маёмасць і сумленна падзеліцца выручкай ад гэтага з дзяцьмі, а пасля астаецца жыць са сваёй невялікай пенсіі.

А вось калі памрэ першай жонка, то ўдавец становіцца зусім бездапаможны. Скора ў ягонай хаце паявіцца бруд і беспарадак, і яму таксама прыйдзецца прадаваць сваю маёмасць. Але мужчына выручкай ад гэтай здзелкі не вельмі падзеліцца з дзяцьмі. Зараз у яго хаце стануць збірацца розныя прайдзісветы і п'яніцы і з іх дапамогай ён тыя грошы хутка растраціць. Такім чынам ён можа прагуляць не толькі дабытак і машыны, але нават усе будынкі.

Вось у адной з вёсак адна сям'я вяла сваю гаспадарку, так як і ўсе, хаця муж любіў заглянуць у кілішак, але жонка старалася не адставаць ад іншых. Аднак яна нечакана памерла і ейны муж на працягу года растраціў усю гаспадарку. За выручаныя грошы ўдавец суцяшаўся з кампаньёнамі і нямнога часу мінула, як ён усё прапіў, не даўшы дзецям і граша.

Калі ўжо ягоныя кішэні апусцелі, падаўся ён да аднаго са сваіх сабутэльнікаў, які не так даўно не вылазіў з ягонай хаты. А там гучна выпівалі і госць падумаў, што і яго прымуць у кампанію з вялікім гонарам. Аднак здарылася інакш — нядаўнія дружбакі ўхапілі яго за каўнер, вытурылі за дзверы і з выспяткам у задніцу шпурнулі носам у гурбу снегу. Пастагнаў ён і заключыў, што няма праўды на свеце.

Але праўда знайшлася, бо скора яны ўсе памірыліся. І гэта парадокс, што калі пасварацца парадачныя людзі, не п'яніцы, то яны часта гадамі касавурацца на сябе, не могуць сабе дараваць. А вось калі п'яніцы пасварацца, а нават і паб'юцца, дык неўзабаве яны мірацца. Мо гэта нам, цвярозым, нейкі прыклад?

Мікалай ПАНФІЛЮК

Хочам смешнага!

Падаю пад развагу Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" як выдаўцу газеты, каб падумала аб стварэнні ў „Ніве" старонкі гумару і сатыры. Была калісь такая ў „Ніве", яе выдумаў рэдактар Георгій Валкавыцкі. Ён жа сам найчасцей рыхтаваў да друку старонку гумару і сатыры — „Ніўку", меў выдатных супрацоўнікаў, якія пісалі спецыяльна ў яе. Многія чытачы „Нівы", між іншымі і я, пачыналі чытаць „Ніву" якраз ад „Ніўкі", ад апошняй старонкі! Дарэчы, і цяпер я, беручы новы нумар нашага тыднёвіка пачынаю чытаць яго ад... канца. Даражэнькія, падумайце сур'ёзна, вярніце смешную старонку! Будзем вельмі рады!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

З'яднала нас „Ніва"!

У 4 нумары „Нівы" ад 25 студзеня друкаваўся мой тэкст „Вітаем у крузе сяброў", у якім заклікаў я стары авангард да супрацоўніцтва з „Нівай". На маю прапанову адклікнуўся ўжо Мікалай Панфілюк. З прыемнасцю магу сказаць, што нядаўна атрымаў я цікавы ліст з Познані ад Анатоля Маўчуна. Праўда, быў адрасаваны ён да мяне, але лічу, што наш прыяцель не пакрыўдзіцца, калі памесцім яго на старонках тыднёвіка.

„Глыбокапаважаны спадар Уладзімір Сідарук, перш за ўсё прыміце маё спачуванне з прычыны спасціглага Вас гора. Мой ліст да Вас пасылаю з прапановай каб — калі для Вас аказалася б гэта ў нейкай меры карысным — час ад часу мець магчымасць абменьвацца з Вамі думкамі, ведамі...

Прызнаюся, пра Падляшша я амаль нічога не ведаю (апрача таго, што піша „Ніва"). У 1956 г. я нават вырашыў, каб пазнаёміцца з гэтым рэгіёнам, шукаць там працу. Аднак з Беластока накіравалі мяне ў Голдап — там работнікі больш былі патрэбнымі... Цяпер — як заўсёды — мяне хвалююць беларускія праблемы, ад Вас многага я мог бы даведацца пра сённяшнюю рэчаіснасць. Рашэнне пакідаю Вам. З пажаданнем усяго Вам найлепшага — Анатоль Маўчун".

Што ж можна адказаць на такія цёплыя словы сябру? Шчырае Вам дзякуй, паважаны спадар Анатоль! З прыемнасцю згаджаюся на далейшую перапіску. Адначасова лічу, што і пра „Ніву" не забудзеце, пашлеце, як раней бывала, допіс. Са свайго боку прапаную не толькі пісьмовую падтрымку, але пры нагодзе летняга адпачынку запрашаю наведаць мой сціплы куточак у Кузаве, што непадалёк Чаромхі. Вёска знаходзіцца на акраіне Белавежскай пушчы. Сарганізуем веласіпедную экскурсію на пагранпераход Полаўцы — Пяшчатка, пазнаёміцеся з фольклорным гуртом „Чарамшына" (пэўна мелі магчымасць паслухаць песні ў іхнім выкананні), ды пакарыстаецеся духмяным паветрам навакольнага лесу. У грыбным сезоне можна з'ездзіць па грыбы ды ягады, якімі натура абдароўвае нас штогод. А вітаць буду Вас па-даўняму: „Чым хата багата...".

Толькі магу на пачатак рэкамендаваць са свайго боку. Затым да хуткай сустрэчы.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую пагаворку.

1. удзельнік баёў, воін = 27 _ 28 _ 16 _ 17 _;
2. ускіпеўшая вада = 5 _ 4 _ 8 _;
3. цёплы край для зімавання пералётных птушак = 14 _ 13 _ 12 _ 15 _ 39 _;
4. гук, які ўтвараецца вібрацыяй галасавых звязак у горле = 29 _ 23 _ 22 _ 30 _ 24 _;
5. пачатак песні = 21 _ 36 _ 35 _ 6 _ 20 _;
6. выцягнутая даперадy частка свінскай галавы = 3 _ 41 _ 1 _;
7. грузінскі порт = 37 _ 38 _ 25 _ 26 _;
8. прадмет для дзіцячай гульні = 40 _ 19 _ 18 _ 11 _ 2 _;
9. нервовы стан, пры якім назіраецца міжвольнае перасмыкванне мышцаў твару, галавы, плячэй = 31 _ 34 _ 7 _;
10. вялікі прыток Дуная, які ўліваецца між Новым Садам і Бялградам = 32 _ 33 _ 10 _ 9 _.

(ш)

					1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19
				20		21	22	23	24	25	26
					27	28	29	30	31	32	33
				34	35	36	37	38	39	40	41

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 9 нумара

Авёс, палын, зуб, Нарва, скон, вы, пядзя, воласць, ямка, планета, арол.

Рашэнне: **Узнёслыя словы не кормяць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

У Нараўцы вяртанне да роднага

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Жыхары Нараўчанскай гміны, так як іх дзяды і прадзеды, звыкліся гаварыць Нараўка, Семяноўка, Новае Ляўкова ці Старое Ляўкова і ў час звычайных размоў не карысталіся польскамоўнымі варыянтамі назваў сваіх родных вёсак і гміннай мясцовасці, хіба што пісьмова афармлялі нейкія справы ў гміннай установе або ва ўстановах Гайнаўкі ці Беластока. Калі мова, на якой вучыла гаварыць маці або бацька, мала рознілася ад беларускай літаратурнай мовы, лёгка было людзям фармаваць сваю нацыянальную свядомасць і таму як у міжваенны, так і ў пасляваенны перыяды масава лічылі яны сябе беларусамі. З радасцю жыхары Нараўчанскай гміны ўспрымалі арганізаваныя, пачынаючы з пяцідзесятых гадоў, беларускія культурныя мерапрыемствы. Масава чыталі „Ніву", кніжкі беларускіх пісьменнікаў і хадзілі на заняткі беларускай мовы.

Цешыць, што радныя з Нараўчанскай гміны сталі чарговымі прыхільнікамі ўвядзення роднай мовы ў гмінную ўстанову; трэці злева — Ян Целушэцкі

Калі я пісаў артыкулы пра ўвядзенне немцамі і літоўцамі двухмоўя, радны Нараўчанскай гміны Ян Целушэцкі заявіў, што будзе хадайнічаць за ўвядзенне беларускай мовы ў якасці дапаможнай у зносінах мясцовага насельніцтва з гміннымі чыноўнікамі і будзе намагацца пераканаць нараўчанскіх радных прыняць пастанову наконт усталявання ўказальнікаў па-польску і па-беларуску (тады яшчэ толькі радныя горада Гайнаўкі рашыліся ўчыніць дапаможнай беларускую мову і ніхто не разлічваў, што чарговы крок у гэтай справе зробіць Арлянская гміна, а нават пойдзе далей, бо робіць намаганні, каб паставіць на сваёй тэрыторыі двухмоўныя ўказальнікі). Намаганні беларускага пісьменніка і нашага карэспандэнта Яна Целушэцкага падтрымаў радны Славамір Кулеша, які пачаў збіраць подпісы ў справе ўвядзення дапаможнай беларускай мовы. Намаганні беларускіх радных закончыліся падрыхтаваннем праекта пастановы аб увядзенні дапаможнай беларускай мовы на сесію гміннай рады, якая праходзіла 24 сакавіка, напярэдадні 91 угодкаў БНР. Аднак у час пасяджэння рады некалькі радных стала крытыкаваць праект аб дапаможнай мове, звяртаючы ўвагу, што і зараз людзі ў гміннай установе могуць гаварыць па-свойму. Радны Славамір Кулеша прасіў скептычна настаўленых радных не тармозіць прыняцця пастановы і пытаў у чым будзе перашкаджаць пастанова аб увядзенні дапаможнай мовы для зносін з насельніцтвам.

— Нельга закрываць дарогі да ўвядзення беларускай мовы як дапаможнай і да замяшчэння беларускіх назваў сёл на ўказальніках, — заклікаў прагаласаваць за праект пастановы радны Ян Целушэцкі.

Аднак паявілася і прапанова, каб спачатку правесці кансультацыі з насельніцтвам, што адтэрмінавала б галасаванне на невядомы час, а ідэя знайшла ўжо ж падтрымку большасці радных. Пасля з'явілася нават прапанова, каб правесці тайнае галасаванне, але яна сустрэлася з крытыкай як скрываючая перад выбаршчыкамі паводзіны радных.

— Мы, як радныя, маем права выступаць ад імя людзей, якія нас выбралі, а я ведаю, што людзі з майго асяроддзя хочуць увядзення беларускай мовы на форум гміны, — пераконваў Ян Целушэцкі. У канцы дыскусіі паявіліся аргументы, што кожны жыхар не павінен апасацца гаварыць на роднай мове ў сваёй гміне, а пры змене ўлады такая забарона заўсёды можа паявіцца. У час галасавання аказалася, што 7 радных прагаласавала за ўвядзенне беларускай мовы як дапаможнай у працы органаў Нараўчанскай гміны, 6 асоб было супраць такога праекта, а двух радных устрымалася ад галасавання. Гэтым самым пастанова была прынята і ў бліжэйшы час нараўчанскія чыноўнікі павінны выступіць у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, каб занесці Нараўчанскую гміну ў рэестр гмін, якія карыстаюцца дапаможнай мовай. Толькі пасля заканчэння гэтай працэдуры можна будзе далей дзейнічаць у справе замяшчэння беларускіх назваў мясцовасцей на ўказальніках. Радны Славамір Кулеша запрапанаваў нават прагаласаваць за хуткае правядзенне кансультацый у гэтай справе з жыхарамі паасобных сёл, аднак большасць радных прыняла пастанову за спыненне на нейкі час працы ў справе ўказальнікаў з двухмоўнымі назвамі вёсак.

Радны Славамір Кулеша — другі ініцыятар увядзення дапаможнай беларускай мовы ў зносінах з мясцовым насельніцтвам

— Не ўсе радныя былі зарыентаваныя ў тэме і была прэсія на радных, каб галасаваць супраць дапаможнай мовы. Таму і пад заявай у гэтай справе падпісалася 11 асоб, а за праект пастановы прагаласавала 7 радных, — каменціраваў пасля галасавання Ян Целушэцкі. Аб прэсіі на радных гаварыў таксама другі ініцыятар пастановы Славамір Кулеша.

Калі Нараўчанская гміна ставіць на турызм, не павінна адкладваць намаганняў у справе двухмоўных указальнікаў. Напрыклад, літоўцы і кашубы націскаюць на МУСіА, каб тое паскорыла працэс афармлення ўсіх спраў і яшчэ перад турыстычным сезонам дала згоду на ўстанаўленне двухмоўных указальнікаў, бо хочуць праз паказванне сваёй нацыянальнай адметнасці затрымаць турыстаў у сваіх гмінах. Да хуткага ўстанаўлення новых указальнікаў пераконваў жыхар Лешукоў Яраслаў Харкевіч.

— Вельмі добра, што ўвялі нашую мову для зносін з чыноўнікамі, але двухмоўныя ўказальнікі былі б таксама нашым гонарам і доказам, што мы не чужыя людзі на сваёй зямлі, і спрычыняліся б да мацавання нацыянальнай свядомасці беларусаў, — заявіў спадар Харкевіч.

— Я вельмі рады, што мы прынялі новую пастанову, — заявіў пасля галасавання малады радны Радаслаў Матысюк з Семяноўкі, які таксама лічыць, што трэба намагацца ў напрамку ўстанаўлення двухмоўных указальнікаў.

Старшыня Рады Нараўчанскай гміны Анджэй Недзьведзь у размове са мной заявіў, што радныя будуць вяртацца да справы падрыхтоўкі праекта пастановы аб замяшчэнні двухмоўных назваў мясцовасцей на ўказальніках. За гэты час гмінныя чыноўнікі маюць шанц спакойна падрыхтаваць праект пастановы. Раней спецыялісты — моваведы і гісторыкі — павінны ўстанавіць назвы сёл па-беларуску, згодныя з гістарычнымі запісамі (што ў рэаліях Нараўчанскай гміны часта супадае з названнямі па-свойму), якія можна будзе замясціць на ўказальніках побач польскамоўных варыянтаў. Калі на змены будзе згода камсіі МУСіА, гэта будзе абазначаць, што ўсе кошты ўстанаўлення новых указальнікаў будуць Нараўчанскай гміне вернуты. Згодна з апошнімі распараджэннямі МУСіА не трэба праводзіць кансультацый з мясцовым насельніцтвам у справе двухмоўных указальнікаў, калі ў гміне пражывае больш за 20% прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці ад агульнай колькасці насельніцтва. Цяпер, напрыклад, без кансультацый ставяць указальнікі немцы на Шлёнску. У час сесіі складвалася ўражанне, што радныя Нараўчанскай гміны не ведаюць новых распараджэнняў МУСіА, але калі яны рашацца на кансультацыі, дык могуць іх праводзіць.

05.04 — 11.04

(22.03. — 20.04.) З сантыментам паўспамінаеш мінулае, можаш вярнуцца да старога кахання. Будзеш шмат зарабляць, але і нямала выдаваць. Да 7.04. правалы і кампраметацыі. Твая заўзятасць і бескампраміснасць у адносінах да калегі можа на працы завесці цябе ў тупік.

(21.04. — 21.05.) Да 7.04. маеш схільнасць маніпуляваць іншымі (вынікі могуць быць жалюгодныя!). 6-10.04. — неабдуманым словам можаш папсаваць свой імідж, а твае думкі на тэму іншых могуць быць зусім нятрапныя. Ад 9.04. камунікатыўнасць, пачуццё гумару, спрыт з'яднаюць табе ўсіх.

(22.05. — 22.06.) У першыя дні тыдня будзеш імпанаваць ведамі; поспехі. З 9.04. (аж да 13.04.) без праблем адкрыеш усе праўды, ніхто перад табой не схаваецца і не падмане цябе. Хочаш зарабіць — не чакай манны нябеснай!

(23.06. — 23.07.) Будзеш імпанаваць іншым сваёй баявітасцю, тактыкай і стратэгіяй. 6-10.04. — магчымая спрэчка (да крыві!) з саюзнікам. 9.04. (поўня Месяца) адчуеш страх, што не паспееш з хатнімі абавязкамі; гэта папсуе тваю эфектыўнасць на працы, нервы.

(24.07. — 23.08.) Нуднавата, але не будзеш наракаць на нагоды для сардэчных сустрэч. Не паддавайся фінансавым прапановам (могуць быць ілюзорныя). 8-12.04. у тваім сэрцы разбушуецца сапраўдная вясна. Набярэшся таксама духу саперніцтва.

(24.08. — 23.09.) Новыя магчымасці, творчы настрой. Пазітыўныя адносіны да свету і людзей. 5-09.04. клопаты ў падарожжы і са здароўем. Пераканаешся, што не меў рацыі, гаварыўшы, што знаешся на людзях і правільна ацаняеш кожную сітуацыю.

(24.09. — 23.10.) 6-10.04. будзеш прымушаны разважыць, у якіх акалічнасцях паддацца, а ў якіх змагацца. Пераканаешся, што ў крытычнай сітуацыі можаш заўсёды разлічваць на партнёра. На працы рабі сваё і нічога нікому не даказвай.

(24.10. — 22.11.) Адчуеш аслабленне, цяжка табе будзе справіцца з дамовамі, а прафесійныя справы могуць уцячы з-пад кантролю. У лары шанц на змены — у лепшы бок. Ідэальны час на рамонт ці перасяленне, а таксама на шліфаванне свайго характару.

(23.11. — 22.12.) Добрая падрыхтоўка да цяжкіх размоў, экзаменаў. 8-12.04. — шмат нагод да развіцця і пашырэння ўласных магчымасцей. Можаш даведацца пра рэчы, якія хавала перад табою блізкая асоба. З 11.04. не злуйся на з'едлівыя заўвагі.

(23.12. — 20.01.) Час працы і адольвання перашкод; калоды, якія табе кінуць пад ногі, будуць вельмі цяжкія! 8-12.04. — клопаты так у прафесійнай, як і ў асабістай сферы. Твая шчырасць можа пайсці ўпустую, хтось можа палічыць тваё старанне малаважным.

(21.01. — 19.02.) Мноства энергіі (увесь месяц). Можаш сабраць сілы і справіцца з тым, на чым табе найбольш залежыць. З 9.04. (да 13.04) можаш горка расчаравацца і ўзлавацца, бо хтось спецыяльна спрабуе ўвесці цябе ў зман.

(20.02. — 21.03.) Шанц наладжання шматабяцаючых кантактаў. Ідэальны час на падпісванне дамоў, падрыхтоўку да вяселля. З 11.04. (аж да 24.04.) пачнецца ў цябе вельмі добры час у фінансах; шчаслівыя нагоды, поспехі ў каханні. Для некаторых спраў гэта будзе „апошні званок"!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960